

ЯК САРТУЮЦЬ ПАШТОВЫЯ АДПРАЎЛЕННІ 5

РАЦЫЁН ДАПАМОЖА ПЕРАМАГЧЫ СЕЗОННУЮ ХАНДРУ 8





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

9 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. СЕРАДА № 192 (29059)


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Беларусь паслядоўна ўкараняе прынцыпы «зялёнай» эканомікі. Сёлета плануецца сфарміраваць Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця да 2035 года, дзе дакладна будуць вызначаны прыярытэты і напрамкі маштабных пераўтварэнняў у эканамічнай, сацыяльнай і экалагічнай сферах. Меры, якія прымаюцца, дазволяць забяспечыць прагрэс у дасягненні Мэт устойлівага развіцця. У аснову пакладзена рэсурсаэфектыўная мадэль эканомікі, якая прадугледжвае «зялёны» вектар развіцця. Яна ўключае экалагічныя вытворчасці, максімальнае выкарыстанне другаснай сыравіны».*

# АДЫСЦІ АД БЕЗДАНІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у другім дні работы міжнароднага форуму «Мінскага дыялогу»

**Першы падобны форум адбыўся ў Беларусі летась, ён быў высока ацэнены міжнароднай супольнасцю і сёлета атрымаў працяг. Ён праходзіць пад назвай «Еўрапейская бяспека: адысці ад краю бездані». «Рады, што вы зноў знайшлі магчымасць узяць удзел у дыскусіі, якая хвалюе ўсіх у міжнародным парадку дня, які, на жаль, дапаўняецца новымі выклікамі, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да ўдзельнікаў пленарнай сесіі высокага ўзроўню. — Пошук адэкватных і своечасовых адказаў на іх з'яўляецца на гэтым этапе адной з найважнейшых задач для экспертнай супольнасці, а таксама для нас, палітыкаў. Пра гэта ў тым ліку сведчаць праведзеныя ў апошні час у Беларусі знешнепалітычныя форумы па шырокай тэматыцы — ад інфармацыйнай бяспекі да тэрарызму. Гэта сведчыць пра відавочны рост інтарэсу заходняй і ўсходняй аўдыторый да Мінска як пляцоўкі для дыялогу».**

## Пагрозы нарастаюць

«Словы «Адысці ад краю бездані» ў тэме нашай канферэнцыі вельмі дакладна выказваюць сутнасць галоўнай праблемы ў сусветнай супольнасці, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Беспрэцэдэнтная напружанасць у міжнародных адносінах, расхістванне асноў міжнароднай бяспекі, рост колькасці рэгіянальных канфліктаў закранаюць большасць кантынентаў». СТАР. 2



Фота БелТА.

Экасвет

# ПРЫРОДА ПАДКАЖА,

## або Як вырасціць «чыстыя» прадукты?



Намеснік кіраўніка сялянскай фермерскай гаспадаркі «СідСад» Алена СІДАРАВА.

**Не трэба думаць, што арганічная сельская гаспадарка — гэта проста вяртанне ў мінулае, калі нашы продкі вырошчвалі сადавіну ды агародніну і ведаць не ведалі пра хімікаты. Новыя тэхналогіі заснаваныя на навуковых ведах. У Еўропе цэлыя інстытуты займаюцца арганічнай сельскай гаспадаркай, шукаюць лепшыя метады і сродкі абароны, устойлівыя сарты. Вядома, і на традыцыйны севазварот, уменне чаргаваць і спалучаць расліны, натуральныя ўгнаенні не трэба забывацца. Але чаму арганічнае земляробства, якое забяспечвае людзей здаровымі і карыснымі прадуктамі, пакуль так павольна развіваецца? Адказ на гэта пытанне можна было атрымаць падчас прэс-тура, арганізаванага экалагічнай установай «Агра-Эка-Культура».**

— Вакол арганічнай сельскай гаспадаркі шмат міфаў. Адзін з іх — апасенне, што, калі ўсе пяройдуць да яе, ежы не хопіць, — расказвае **старшыня праўлення «Агра-Эка-Культуры» Лана СЕМЕНАС.** — Але ж пры змене клімату, у экстрэмальных умовах, напрыклад, падчас працяглых засух ці дажджоў, арганічныя палі пакутуюць менш і там ураджай лепшы, бо пры такім земляробстве гаспадары працуюць з глебай, каб паляпшаць яе структуру і ўрадлівасць, у выніку стварaецца ўстойлівая экасістэма. Яшчэ адзін міф — без гербіцыдаў не атрымаць ураджаю, усё з'ядуць шкоднікі ці хваробы. Але чаму тады сёння ва ўсім свеце ў крамах прадаюцца такія прадукты? СТАР. 4

**КОРАТКА**

- **Тэрмін платы за цяпло і газ па поўных тарыфах для людзей, не занятых у эканоміцы, перанесіцца на 1 мая 2020 года.**
- У Брэсцкай вобласці на мандат дэпутата парламента прэтэндуюць у сярэднім пяць чалавек.
- **Фермеры Гродзенскай вобласці асвойваюць вытворчасць кармоў з тапінамбуру.**
- «Брэсцкая крэпасць-герой» прызнана найлепшым славянскім аб'ектам спадчыны на форуме ў Чарнагорыі.



# БАБУЛЯ ЦІ ЖАНЧЫНА ЭЛЕГАНТНАГА ЎЗРОСТУ?

Якімі бачаць людзей 55+? Якімі яны бачаць сябе самі?

**Грамадская думка ўсё яшчэ прапануе нашай жанчыне пасля 55—60 гадоў заслужаны адпачынак, вышыванне крыжыкам і ролю бабулі. Але, можа, рана ставіць крыж на цікавым і актыўным жыцці? На Захадзе ўжо даўно кажуць аб «трэцім узросце» — актыўным перыядзе пасля 60—65 гадоў. Гэта ўзрост, які папярэднічае ўласна старасці з усімі яе атрыбутамі. Іншымі словамі, у свеце ўзнікае новае стаўленне да людзей старэйшага ўзросту і новая культура старэння. І гэтая культура пакуль яшчэ павольна, але прыходзіць і да нас.**

Тым не менш многія ўсё яшчэ лічаць: выйшаў на пенсію — усё, сядзі і маўчы. А ў многіх маладых людзей склаўся стэрэатып аб пажылых як аб канфліктных, якія часам ледзь не наўмысна ідуць на пошту, у банк або паліклініку, каб пасварыцца з кімсьці. Многія ўпэўнены, што характар з гадамі псуецца... СТАР. 12



ISSN 1990 - 763X

19192>

9 771990 763008

# АДЫСЦІ АД БЕЗДАНІ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Беларусь, па словах яе лідара, ужо пачала біць у набат, заклікаючы спыніць супрацьстаянне. «Апошнім часам асабліва многа гавораць пра неабходнасць дыялогу, умацаванне мер даверу і пошук кампрамісаў. Але свет, на жаль, лепшым не становіцца, — заўважыў Прэзідэнт. — Больш за тое, мы з'яўляемся сведкамі новага вітка стратэгічнага саперніцтва так званых «вялікіх дзяржаў», «полюсаў сілы». Гандлёвыя войны і санкцыйнае супрацьстаянне набіраюць абароты. Абвастраецца барацьба за энерганосьбіты і сыравінныя рэсурсы. Шматлікія ўзброеныя і замарожаныя канфлікты на Блізкім Усходзе, у Азіі, Лацінскай Амерыцы і Еўропе не вырашаюцца».

«Новым, раней невядомым прэцэдэнтам сталі атакі з дапамогай беспілотнікаў на нафтавыя аб'екты Саудаўскай Аравіі. Свет убачыў новую зброю, танную і даступную, але здольную нанесці непапраўную шкоду не толькі адной дзяржаве, але і планеце ў цэлым, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Цалкам відавочна, у спісе сучасных выклікаў чалавецтву дамінуюць пагрозы бяспецы».

Пры гэтым шматбаковыя пляцоўкі, у тым ліку ААН, АБСЕ, становяцца месцам высвятлення адносін, а не вырашэння праблем, заўважыў Прэзідэнт. Сістэма ваенна-палітычных стрымліванняў і процівагаў разбураецца на вачах, а міжнародныя арганізацыі пакуль не могуць спыніць гэты працэс. «Магчыма, не жадаюць, а магчыма, тыя, хто дамінуе ў гэтых арганізацыях, зацікаўленыя ў гэтым», — дапусціў выступоўца.

Нас не можа не хваляваць той факт, што градус недаверу і канфрантацыі паміж Расіяй і Захадам дасягнуў мяжы, сказаў беларускі лідар.

«Пасля нядаўняга выхаду з Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці двух ключавых яго ўдзельнікаў працэс разбурэння архітэктуры кантролю над узбраеннямі фактычна выйшаў на фінішную прамую. Апошні рубеж — Дагавор па стратэгічных наступальных узбраеннях. Калі бакі не дамовяцца аб яго падаўжэнні, усяго праз два гады (у 2021 годзе) свет апынецца ў сітуацыі, калі адносіны ў сферы ядзерных узбраенняў наогул не будуць нічым рэгулявацца!» — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Чалавецтва сямімільнымі крокамі рухаецца да рысы, за якой, на думку Прэзідэнта, — бездань. «На жаль, даводзіцца прызнаць, што ў вялікіх дзяржаў ёсць падставы ставіцца адно да аднаго з недаверам. Недружалюбныя і нават агрэсіўныя дзеянні ў мінулым укараняюць узаемныя падазрэнні і асцярогі на доўгія гады наперад».

## Выкарыстаць рэсурс Беларусі

Ідэальным рашэннем актуальных задач Аляксандр Лукашэнка бачыць вяртанне да канцэпцыі еўрапейскай бяспекі, заснаванай на супрацоўніцтве, да каштоўнасцяў Хельсінскага заключнага акта і Парыжскай хартыі для новай Еўропы.

Беларускі лідар упэўнены: «Нам усім тэрмінова трэба моцная гісторыя поспеху, якая пераканае нават заўзятых скептыкаў і «ястрабаў». Нягледзячы на глыбокія супярэчнасці і недастатковае разуменне, інтарэсы бяспекі ў Еўропе абсалютна сумяшчальныя».

Прыклад такога поспеху можа прадэманстраваць Беларусь, якая за апошнія два дзесяцігоддзі апынулася ва ўнікальнай сітуацыі. «З аднаго боку, мы — ваенна-палітычны саюзнік Расіі і ўдзельнік АДКБ. Ні ў адной дзяржавы няма такога ўзроўню адносін з Масквой, як у нас», — заявіў Лукашэнка. У той жа час, як кажа кіраўнік дзяржавы, Беларусь заключыла міжнародныя дагаворы ў галіне бяспекі і мер даверу з усімі суседзямі, у тым ліку з дзяржавамі-членамі НАТА.

«Мы гатовыя напаўняць гэтыя двухбаковыя пагадненні новым зместам, удасканальваць іх. Сігналы, якія атрымліваем ад нашых партнёраў, кажуць пра тое, што і яны гатовыя да такога ўзаемадзеяння. Гэта ўнікальны рэсурс у цяперашняй сітуацыі. І мы ўсе абавязаныя ім скарыстацца. Каб мы, еўрапейцы, даказалі самі сабе і ўсяму свету, што архітэктура еўрапейскай бяспекі можа быць адноўлена. Што можа быць іншая мадэль стасун-



Фота БелТА.

каў Расіі і НАТА, Кітая і ЗША і яе праекцыя на Еўропу. Не такая, як апошнія пяць гадоў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што Беларусь шмат у чым фарміруе гісторыю поспеху ў пытаннях рэгіянальнай бяспекі.

«Мы і далей будзем працягваць гэты курс, як бы камусьці ён ні быў не даспадобы. Мы чуем, бачым, што нехта падвяргае сумненню, камусьці шкада, што не ўсё Беларусь можа, а мабыць, і нічога не можа, а нехта проста ўхмыляецца: ды ну, ці ім вырашаць нейкія пытанні? Шаноўнае спадарства, мы нічога не збіраемся вырашаць за кагосьці! Дай божа за сябе вырашыць. Мы проста вам прапануем: давайце збірацца ў гэтым ціхім, спакойным — пакуль што — месцы, і будзем абмяркоўваць нашы праблемы», — звярнуўся да ўдзельнікаў форума кіраўнік дзяржавы.

Ён нагадаў, што наша краіна прыкладае максімум намаганняў і мае намер гэтак жа дзейнічаць і надалей. З моманту атрымання незалежнасці і суверэнітэту яна ўжо больш за чвэрць стагоддзя выступае донарам стабільнасці, чыстым паставўшчыком і еўрапейскай, і міжнароднай бяспекі. Таму гісторыя поспеху Беларусі як надзейнага партнёра, які карыстаецца даверам і Усходу, і Захаду, магла б стаць адказам на пытанне, ці магчыма зрабіць Усходнюю Еўропу трансгранічным поясам стабільнасці і канструктыўнага ўзаемадзеяння.

## Еўропа без ракет

У якасці першага кроку ў рэалізацыі гэтай амбіцыйнай місіі афіцыйны Мінск аб'явіў, што, нягледзячы на разбурэнне Дагавора аб ракетах сярэдняй і меншай далёкасці, Беларусь, якая была паўнапраўным удзельнікам, працягне яго выконваць, калі не будзе адпаведных знешніх пагроз для нашай краіны.

«Магчыма, усё ж такі варта сабрацца і абмеркаваць гэту, бадай, самую актуальную на цяперашні момант праблему. Калі жадаеце, у Мінску. Не хочаце — давайце ў нейкім іншым месцы. Тым больш што Беларусь ужо выступіла з прапановай прыняць шматбаковую палітычную дэкларацыю адказных краін аб неразмяшчэнні ракет сярэдняй і меншай далёкасці ў Еўропе. Гатовы нават ініцыяваць, узяць на сябе распрацоўку тэксту гэтага дакумента», — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка.

Такая дэкларацыя не з'яўляецца раўназначнай заменай Дагавора. Але яна магла б дапамагчы ў запаўненні прававога вакууму ў рэгуляванні гэтага сегмента ўзбраення. Прэзідэнт Беларусі спадзяецца, што такі дакумент атрымае падтрымку многіх дзяржаў і стане практычным унёскам у рэалізацыю нашай ініцыятывы аб запуску міжнароднага дыялогу па бяспецы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што сёння новую гісторыю поспеху еўрапейскай бяспекі трэба збіраць літаральна па крупінках. Малыя і сярэднія дзяржавы, такія як Беларусь, могуць зрабіць рэальны ўнёсак у адраджэнне «духу Хельсінкі» на еўрапейскай прасторы. Рэалізацыя такога падыходу выгадна ўсім ключавым сусветным гульцам — і Расіі, і ЕС, і ЗША, і Кітаю.

## Ключавое пытанне — Данбас

Прэзідэнт не абмінуў у сваім выступленні сітуацыю на ўсходзе Украіны. Паводле яго слоў, рэгіён не можа выбрацца з багны сацыяльнага, эканамічнага і гуманітарнага хаосу. Ключавое пытанне бяспекі ў Еўропе — вырашэнне канфлікту ў Данбасе, упэўнены ён.

«Гэтая праблема — свайго роду лакмусавая паперка для еўрапейскай супольнасці. Украінскі канфлікт патрабуе ад нас яго вырашэння. Калі мы яго вырашым — значыць, мы на нешта здольныя. Калі не, то будзем збірацца і размаўляць не ў Мінску, дык у Маскве. Не ў Маскве, дык у Парыжы, Берліне і яшчэ дзесьці, але толку будзе мала», — упэўнены Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што некалькі дзён таму вярнуўся з Жытоміра, дзе праходзіў чарговы беларуска-украінскі Форум рэгіёнаў, які меў эканамічны фармат. Але і там не абышлося без палітыкі. Адбылася грунтоўная размова па шырокім коле тэм з Прэзідэнтам Уладзімірам Зяленскім. Беларускі лідар яго назваў сапраўдным патрыётам сваёй радзімы, свядомым палітыкам, гатовым да складаных рашэнняў для дасягнення міру.

«У Беларусі рады, што ў працэсе вырашэння канфлікту з'яўляецца прагрэс — ажыццёўлены абмен затрыманымі асобамі, у Мінску на пасяджэнні Трохбаковай кантактнай групы таксама намеціўся нейкі рух. Але калі нехта думае, што пасля прыняцця рашэнняў у Мінску (а там проста яшчэ раз былі канкрэтызаваны Мінскія пагадненні «нармандскай чацвёркі») лёд кранууся, то не. Ён не крануўся і не кранецца, калі мы не падштурхнём працэс», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Так адбываецца, таму што новага Прэзідэнта Украіны пакінулі сам-насам з праблемамі, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Ён заклікаў паглядзець на падзеі, што цяпер адбываюцца ў Кіеве. «Там пэўныя сілы выкарыстоўваюць сітуацыю, каб увогуле прыціснуць новую ўладу і новага прэзідэнта. І Еўропа маўчыць. Але ж вайна не толькі ва Украіне, яна вакол нас, у нашым доме. І вырашаць гэту праблему нам».

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены: без удзелу ЗША канфлікт ва Украіне ўрэгуляваць не атрымаецца.

«Трэба не толькі спыніць вайну, трэба аднавіць Данбас», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён паўтарыў, што Беларусь не рвецца ў пасрэднікі ці міратворцы: «Ніколі мы так не ставілі пытанне. Мы гатовыя як блізкія і родныя людзі, калі Украіна і Расія дамовяцца, сыграць тую ролю, якая імі будзе вызначана нам».

## Лёсавызначальныя тэмы

Лідар Беларусі падкрэсліў: імгненнага, універсальнага рэцэпту нармалізацыі сітуацыі ў свеце і Еўропе няма. Але ёсць універсальны інструмент, значэнне якога немагчыма пераацаніць, — гэта дыялог, дзякуючы якому можна адысці ад краю бездані глабальнага канфлікту, дзе не будзе пераможцаў.

«Усё больш відавочная неабходнасць правядзення ў найбліжэйшыя гады міжнароднага саміту ў рамках «новага працэсу Хельсінкі», — пад эгідай АБСЕ, а магчыма, пад эгідай ААН. Трэба прыняць дакумент стратэгічнага характару па ўмацаванні міжнароднай бяспекі ў Еўраатлантыцы, і ў больш шырокім маштабе. Сёння немагчыма вырашаць гэтыя пытанні без такога цяжкавагавіка, як Кітайская Народная Рэспубліка. Важна ўлічваць таксама меркаванне і іншых краін, чый уплыў у свеце сёння расце», — сцвярджае Прэзідэнт.

Беларусь гатова прасоўваць ідэю «Хельсінкі-2», дыялог Еўразаюза і ЕАЭС, АДКБ і НАТА, спалучэнне з кітайскім праектам «Адзін пояс, адзін шлях», з ШАС і АСЕАН, стварэнне «пояса лічбавага добрасуседства».

«Будзем падтрымліваць усе канструктыўныя ідэі, накіраваныя на пераадоленне раздзяляльных ліній, захаванне міру», — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ён асабліва спадзяецца на аналітычныя дыскусіі пляцоўкі «Мінскага дыялогу». Эксперты (у адрозненне ад палітыкаў) не абмежаваныя ў сваіх меркаваннях і могуць дазволіць сабе сказаць усё, што лічаць патрэбным, пазначыць любыя нестандартныя ідэі, прапанаваць рашэнні, якія цяпер патрэбныя міжнароднай супольнасці.

* * *

На сесіі высокага ўзроўню свае думкі наконт праблемы бяспекі ў рэгіёне выказалі эксперты, сярод якіх быў **прэзідэнт Грузіі ў 2013—2018 гадах Георгій Маргвелашвілі.** Ён адзначыў, што для выпрацоўкі адказу на новыя выклікі неабходна вырашыць старыя праблемы.

**Прэзідэнт Харватыі ў 2000—2010 гадах Сцяпан Месіч** бачыць будучыню ў супрацоўніцтве, рэалізацыі новых агульных мэт.

«Сёння ў вырашэнні праблем мы павінны абапірацца на досвед, які ўжо маем, і адначасова выпрацоўваць новы інструментарый», — выказала ўпэўненасць **кіраўнік праграмы «Глабальная Еўропа» Цэнтра Вудра Вільсана, экс-вярхоўны прадстаўнік Еўрапейскага саюза па знешняй палітыцы і палітыцы бяспекі і першы віцэ-прадстаўнік Еўрапейскай камісіі баранеса Кэтрын Эштан (Вялікабрытанія).**

**Старшыня Часовай камісіі па інфармацыйнай палітыцы і ўзаемадзеянні са СМІ Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Аляксей Пушкоў** пераканаyы: для захавання аднаго з самых прыгожых кантынентаў у свеце трэба крыху менш настойваць на палітыцы з пазіцыі сілы.

**Старшы навуковы супрацоўнік Атлантычнага савета, экс-намеснік Генеральнага сакратара НАТА Аляксандр Вершбоў (ЗША)** падкрэсліў: каб рухацца наперад у вырашэнні праблем, неабходна прытрымлівацца прынцыпу суверэнітэту дзяржаў, вяршэнства міжнароднага права.

Так ці інакш, усе ўдзельнікі Форуму «Еўрапейская бяспека: адысці ад краю бездані» выказалі ўпэўненасць, што адысці ад гэтага краю можна толькі, вобразна кажучы, узяўшыся за рукі. Гэта ў інтарэсах кожнага без выключэння народа Еўропы.

**Марыя ДАДАЛКА,**
**Варвара МАРОЗАВА,**
**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Мінск зблізае народы

## Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з экс-прэзідэнтам Харватыі Сцяпанам Месічам

**На сустрэчы падчас міжнароднай канферэнцыі «Еўрапейская бяспека: адысці ад краю бездані» абмеркаваны некаторыя гістарычныя моманты развіцця краін Балканскага паўвострава, пытанні, звязаныя ў цэлым з умацаваннем міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі. Сцяпан Месіч згадаў пра некаторыя гістарычныя моманты і ролю тагачаснай Югаславіі ў сусветнай палітыцы.**

Экс-прэзідэнт Харватыі ўдзельнічаў у рабоце міжнароднай канферэнцыі ў Мінску і ў сваім выступленні закрануў важныя тэмы бяспекі і працідзеяння актуальным выклікам і пагрозам.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Сцяпану Месічу за прыезд у Мінск.

«Для нас гэта вельмі важна. З вашага выступлення я яшчэ лепш пра вас даведаўся. Кардынальна палепшылася меркаванне пра тых людзей, што жылі ў некалі вельмі моцнай краіне, якой мы зайздросцілі, у якой мы вучыліся», — адзначыў беларускі лідар.

Як падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі, Югаславія ў свой час была магутнай дзяржавай, напэўна, таму — непажаданай некаторым уладным людзям.

«Гэта маё цвёрдае перакананне. І вось я сёння, слухаючы ваша выступленне, не мог пазбавіцца гэтай думкі», — сказаў ён.

**Паводле БелТА.**

Эканамікс

# Поспех прыватны — карысць дзяржаўная

## Прэзумпцыя добрасумленнасці, законапаслухмянасць бізнесу і прастата ў падатках

**Гэтыя і іншыя пытанні абмяркоўвалі ўчора ўдзельнікі пасяджэння Савета па развіцці прадпрымальніцтва, якое адбылося ў новым будынку Вярхоўнага суда краіны. Эксперты намагаліся знайсці адказ, як вызначаць прэзумпцыю добрасумленнасці суб'ектаў гаспадарання, разбіраліся з артыкулам 33 Падатковага кодэксу і разглядалі асаблівасці правапрымяняльнай практыкі.**

Усе суб'екты гаспадарання добрасумленныя, пакуль суд не дакажа адваротнага. Менавіта гэты прынцып неабходна закладваць як галоўны ва ўзаемадзеянні бізнесу і дзяржавы, заўважыў **Аляксандр ТУРЧЫН, старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва, першы намеснік прэм'ер-міністра.**

Савет створаны як пастаянна дзеючы орган пры Прэзідэнце Беларусі, і ў яго склад уваходзяць кіраўнікі найбольш паспяховых прыватных прадпрыемстваў.

— Гэта людзі, якія няхай і не ў поўным аб'ёме, але ўвасабляюць сабой эліту нашага бізнесу. Людзі, за якімі стаяць шматтысячныя працоўныя калектывы, якія плацяць падаткі, таму да іх думкі абавязкова варта прыслухацца, — мяркуе старшыня Савета.

Дзяржава робіць сур'ёзныя крокі па лібералізацыі бізнесу ў краіне. Адменены Указ № 488, з 1 ліпеня лібералізаваны шэраг артыкулаў Крымінальнага кодэксу. У той жа час бізнес-суполка асцерагаецца, пэўна ж у нечым і справядліва, што могуць паўтарыцца негатыўныя гісторыі, якія мелі месца ў недалёкім мінулым, адзначыў старшыня Савета:

— Мы хочам пачуць і асцярогу экспертнай суполкі, і каб нашы калегі з сілавога блока адказалі на пытанні, якія цікавяць экспертаў.

Ён таксама акрэсліў сітуацыю адносна артыкула 33 Падатковага кодэкса. Артыкул датычыцца выплаты падаткаў, утойвання прыбытку, адсутнасці рэальнай гаспадарчай дзейнасці і іншых нормаў, парушэнне якіх, наўмыснае ці памылковае, цягне праверку і пакаранне.

— Гэты артыкул — не дакладная копія Указа № 488 аб ілжэпрадпрымальніцтве. Аднак усё залежыць ад таго, як будзе рэалізоўвацца гэты артыкул у правапрымяняльнай практыцы. У нас нармальныя законы, проста трэба навучыцца іх правільна выконваць. Менавіта суд ставіць канчатковую кропку ў спрэчках, аднак прапісаць у заканадаўстве кожны выпадак і сітуацыю немагчыма, — акрэсліў Аляксандр Турчын.

Эфект ад змен, якія прымаюцца, старшыня Савета разглядае праз прызму эканомікі і кажа: «Сёння паспяховае развіццё бізнесу — гэта рост нашай эканомікі, павелічэнне выплат у бюджэт і рост дабрабыту народа. Наш бізнес законапаслухмяны, усе стараюцца плаціць падаткі, аднак, як і паўсюль, тут ёсць свае выключэнні».

Аляксандр Турчын дадаў таксама, што ў грамадстве прысутнічаюць нейкія ілюзіі адносна таго, што такое малы і сярэдні бізнес:

— Сярэдні бізнес сёння — гэта кампаніі прыкладна да 250 чалавек. Ва ўмовах высокатэхналагічнасці нашага свету і вытворчасці кампанія ў 200 чалавек — гэта ўжо даволі вялікая арганізацыя. Вельмі важная ўмова, думаю, прастата: і падатковага заканадаўства, і іншых рэчаў. Для індывідуальных прадпрымальнікаў і мікрапрадпрыемстваў, дзе занятыя два-тры чалавекі, усё павінна быць гранічна проста, каб немагчыма было памыліцца. Калі ж ты наўмысна ідзеш на парушэнне, за гэта прадугледжана адказнасць.

**Ірына СІДАРОК.**

Чулі?!



# НОВЫ ТУРНІР КАЛЯ МОРА

## 12 кастрычніка стартуюць першыя Сусветныя пляжныя гульні. Удзельнічаюць і беларусы

**Першапачаткова планавалася, што мультыспартыўны турнір пройдзе ў Сан-Дыега, але 14 чэрвеня 2019 года Асацыяцыя нацыянальных алімпійскіх камітэтаў прыняла рашэнне перанесці гульні ў Катар, растлумачыўшы гэта рашэнне фінансавымі праблемамі. У гульнях возьме ўдзел больш за тысячу спартсменаў з 97 краін свету. Спаборнічаць атлеты будуць у 14 дысцыплінах.**

На пляжы пройдзе футбол, тэніс, гандбол, валейбол (4х4), барацьба і каратэ (індывідуальны кат). На вадзе — парусны спорт, водныя лыжы (вейкбордынг і скачкі), плаванне на адкрытай вадзе (5 км). Экшн-спорт будзе прадстаўлены скейтбордынгам (парк), боўлдэрынгам, баскетболам (3х3), аквафлонам.

Мэта арганізацыі спаборніцтваў — аб'яднаць атлетаў папулярных у моладзі спартыўных дысцыплін і спартыўных фанатаў новага пакалення з усіх краін свету. Беларусь на гэтых буйных спаборніцтвах будзе прадстаўлена трыма спартсменамі, у Досе выступяць лідары зборнай па водных лыжах Сцяпан Шпак, Ганна Стральцова і Аляксандра Данішэўская. У нацыянальнай зборнай Беларусі адзначылі, што на старты адпраўляюцца вядучыя атлеты, якія ўжо дэманстравалі высокія вынікі на міжнародных спаборніцтвах. Напрыклад, Ганна Стральцова з'яўляецца сярэбраным прызёрам чэмпіянату свету 2019 года.

Талісманам І Сусветных пляжных гульняў абраны дэльфін Долфі. Плануецца, што спаборніцтвы па пляжных і водных відах спорту будуць праводзіцца адзін раз у два гады пад кіраўніцтвам Асацыяцыі нацыянальных алімпійскіх камітэтаў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Май на ўвазе

# Добры дзень, сталічныя «зайцы»...

## Кантралёры будуць спыняць аўтобусы паміж прыпынкамі

**У Мінску з гэтага аўторка кантралёры змогуць спыняць грамадскі транспарт паміж прыпынкамі, каб праверыць аплату праезду. Аб гэтым паведаміў дырэктар філіяла «Агенцтва Мінсктранс» Сяргей ЛАСІЦКІ.**




Паводле яго слоў, спачатку навіну апрабуюць на аўтобусах. Спыняць іх работнікі кантрольна-рэвізорскай службы будуць з дапамогай паднятага сігнальнага дыска, падобнага на той, што выкарыстоўвае транспартная інспекцыя для спынення кіроўцаў аўто. Плануецца, што кантралёры будуць спыняць аўтобусы ў месцах, бяспечных для ўсіх удзельнікаў руху.

«Кіроўца адкрые толькі пярэднія дзверы, увайшоўшы ў якія, кантралёры заблакіруюць валідатары і кампосцеры. Аўтобус адправіцца далей па маршруце, а супрацоўнікі кантрольна-рэвізорскай службы ў дарозе будуць правяраць аплату праезду», — расказаў Сяргей Ласіцкі. Ён адзначыў, што задача не ў тым, каб аштрафаваць як мага больш пасажыраў, а каб заахвоціць іх аплачваць праезд.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША правядуць найбуйнейшую за апошнія 25 гадоў перакідку войскаў у Еўропу



Злучаныя Штаты плануюць налета правесці найбуйнейшую за апошнія 25 гадоў перакідку войскаў у Еўропу — у Прыбалтыку і Польшчу — у рамках маштабных вучэнняў Defender 2020. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні размешчанага ў Вісбадэне штаба арміі ЗША ў Еўропе. Усяго ў вучэннях задзейнічаюць каля 37 тысяч вайскоўцаў з 19 краін, прычым будзе перакінута каля 20 тысяч амерыканскіх салдат. Заяўленай мэтай манеўраў з'яўляецца павышэнне баяздольнасці НАТА і застрашэнне патэнцыйнага праціўніка. Германія стане лагістычным цэнтрам падчас вучэнняў, якія пройдуць у перыяд з красавіка да мая 2020 года. Яны заклікаты праверыць хуткасць перакідвання войскаў НАТА і ўзровень іх узаемадзеяння. «Гэтыя здольнасці важныя, каб за кароткі прамежак часу паказаць моц. Наша баяздольнасць супакойвае саюзнікаў і адпужвае магчымага саперніка», — заявіў камандуючы арміяй ЗША ў Еўропе Крыстафер Каволі. Германскі бок лічыць важным у ходзе вучэнняў праверыць магчымасці існуючай інфраструктуры — мастоў і шляхоў зносін — для перакідвання буйных сіл, адзначае агенцтва DPA.

### У 60 гарадах свету праходзіць «паўстанне вымірающых»




Двухтыднёвая пратэстная кампанія «Паўстанне вымірающых» арганізацыі Extinction Rebellion прысвечана барацьбе са зменамі клімату. Яна праходзіць у многіх буйных гарадах свету, у тым ліку ў Лондане, Берліне, Амстэрдаме і Сіднеі. Яе ўдзельнікі пагражаюць перакрываць дарогі, замінаць рабоце грамадскага транспарту і метро, а таксама ведамстваў і буйных карпарацый. Extinction Rebellion сцвярджае, што цяперашнія пратэсты будуць у пяць разоў больш маштабныя, чым аналагічная акцыя, якая праходзіла ў красавіку. Тады паліцыя затрымала больш за 1100 чалавек. Рух Extinction Rebellion, утвораны ў 2018 годзе, патрабуе, каб ўрады абвясцілі надзвычайную сітуацыю з-за стану клімату і экалогіі і прынялі неадкладныя захады для барацьбы з глабальным пацяпленнем. Сімвал пратэсту — пясочны гадзіннік, які адлічвае час, што застаўся чалавецтву. Арганізатары руху чакаюць, што ў кастрычніцкіх пратэстах толькі ў Лондане возьме ўдзел да 30 тысяч чалавек.

### Нідэрланды адмаўляюцца называцца Галандыяй



Урад Нідэрландаў вырашыў цалкам адмовіцца ад выкарыстання турыстычнай назвы Галандыя ў рэкламе сваёй краіны. Цяпер ва ўсіх рэкламных матэрыялах будзе выкарыстоўвацца яе афіцыйная назва. Рашэнне было ўзгоднена з цэлым шэрагам зацікаўленых бакоў, такіх як цэнтральны ўрад, савет па турызме і прадстаўнікі бізнесу, піша Forbes. У міністэрстве замежных спраў патлумачылі, што Нідэрландам неабходны больш уніфікаваны і скаардынаваны нацыянальны брэндынг: назва Галандыя з'яўляецца больш распаўсюджанай, але асацыюецца выключна з кварталам «чырвоных ліхтароў» Амстэрдама і ўжываннем лёгкіх наркотыкаў. «Мы хочам прадставіць Нідэрланды як адкрытую, вынаходлівую і інклюзіўную краіну. Мы мадэрнізавалі наш падыход», — заявілі ў прэс-службе міністэрства. Новая назва будзе выкарыстоўвацца, у прыватнасці, на конкурсе песні «Еўрабачанне-2020», які пройдзе ў горадзе Ратэрдам. Яна таксама будзе фігураваць ва ўсіх матэрыялах, звязаных з Алімпійскімі гульнямі 2020 года ў Токіа. Адзначаецца, што мацней за ўсё адмова ад назвы Галандыя паўплывае на футбольную зборную краіны і савет па турызме. У той жа час рэбрэндынг дазволіць рэгуляваць паток гасцей у краіну. Так, колькасць наведвальнікаў Амстэрдама дасягнула ўзроўню, які многія называюць непрымальным.

Бяспека

# Праверыць жыллё дапамогуць ратавальнікі

**Каля 70 працэнтаў пажараў у гадавым разрэзе адбываецца падчас ацяпляльнага сезона. Пік іх прыпадае на снежань. Таму МНС разам з прадстаўнікамі міністэрстваў унутраных спраў, аховы здароўя, энергетыкі і жыллёва-камунальнай гаспадаркі праводзе з 16 кастрычніка да 1 лістапада традыцыйную акцыю «За бяспеку разам».**

— Перш за ўсё ўвагу звернем на людзей, якія жывуць адны, інвалідаў, сем'і з дзецьмі ў сацыяльна небяспечным становішчы, — зазначыў **начальнік упраўлення нагляду і прафілактыкі МНС Дзмітрый ТУРЧЫН.** — Спецыялісты абследуюць жыллё. Прычым абследаваць сваё жыллё на прадмет проціпажарнай бяспекі могуць усе ахвотныя. Для гэтага проста трэба падаць заяву. І варта сказаць, што іх колькасць увесь час расце. І мы вельмі ўдзячныя такім людзям, бо яны самі выказваюць цікавасць да таго, каб правесці зіму без пажараў. У некаторых выпадках мы паставім аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі.

Па дзяржаўных праграмах гэтыя апараты з'явіліся больш чым у 50 тысячах дамоў. На іх рахунку — амаль 2,5 тысячы выратаваных жыццяў.

— Толькі летась дзякуючы аўтаномным пажарным апавяшчальнікам 104 пажары былі выяўлены на ранняй стадыі, — паведаміў Дзмітрый Турчын. — Уратаваліся 110 чалавек, сярод іх 17 дзяцей. Сёлета такіх выпадкаў было ўжо 66.

Але пераважная большасць пажараў здараецца з-за класічнай схемы: выпіў — закурыў у ложку — заснуў. Па звестках МНС, на долю людзей, якія вядуць асацыяльны спосаб жыцця ці злоўжываюць алкаголем, прыходзіцца каля 55 працэнтаў ад усёй колькасці ўзгаранняў.

Агулам жа на 8 кастрычніка ў Беларусі адбылося 4819 пажараў. Гэта прыкладна на пяць працэнтаў больш за леташні паказчык. Тлумачыцца гэта тым, што ў вельмі цёплым і засушлівым красавіку адбылося шмат пажараў у экасістэмах. А вось колькасць загінулых, наадварот, знізілася — з 377 да 338 чалавек.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ПРЫРОДА ПАДКАЖА...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Некаторыя лічаць, што арганічная садавіна — гэта яблык з чарвяком, хоць насамрэч такая прадукцыя для любога фермера — брак. Арганічныя фермеры проста выкарыстоўваюць іншую сістэму абароны, знаходзяць памочнікаў у прыродзе.

## У птушыным царстве

Пераканацца ў гэтым удалося ў вёсцы Сашыца Бярозаўскага раёна, у гаспадарцы **арганічнага фермера Дзмітрыя ЛУТАЕВА.** Ён апрацоўвае больш за гектар зямлі і вырошчвае каля 30 розных культур (гарбузы, цыбулю, часнок, памідоры, фасолю, перцы, кавуны, дыні, кукурузу, свежую зеляніну). Бярозаўскі фермер — адзін з заснавальнікаў арганічнага фермерскага кааператыва і першай у Беларусі інтэрнэт-крамы арганічных прадуктаў «Кансорцыя».

**«Неабходна, каб замест стаўлення да экафермераў «ну, няхай будуць» з'явілася ўстаноўка «трэба, каб былі!»**

А вось шматлікія сланечнікі на яго ўчастку — не для продажу, расліны застануцца на зіму некранутыя — гэта пачастунак для птушак. Выдатны спосаб прывабіць і падтрымаць самых удзячных памочнікаў агародніка — сінічак! Кусты ажыны на ўчастку, гэтак жа, як і непрыбранае дзікае кустоўе, — зноў жа і прыстанак для птушак, і месца зімоўкі вожыкаў і баговак.

Дзмітрый мае сертыфікат арганічнай сельскай гаспадаркі Еўрапейскага саюза, а значыць, у любы час да яго з праверкай могуць прыбыць інспектары. Правяраюць яны і прадукты, і вытворчасць, у тым ліку тое, як гаспадар працуе з глебай, як збірае і захоўвае ўраджай.

...Ідзём па ўчастку, падзеленым на асобныя палі, каб прасцей было весці севазварот, і не верыцца, што ўсяго тры гады таму тут расло такое пустазелле, што з-за яго не было відаць дома — участак 20 гадоў прастаяў закінуты.

«Калі пачынаў, у мяне нават інструментаў не было, рыдлёўку і вілы браў у суседа», — кажа гаспадар. Кавалак за кавалкам ён абкшываў свой надзел, абзавёўся матаблокам і прызнаецца, што толькі сёлета яму ўдалося больш-менш прывесці гаспадарку да такога стану, які ён хацеў бы бачыць. У планах узяць яшчэ зямлі — пад вырошчванне збожжавых, якія пойдуць на кармы (Дзмітрый трымае і птушнік). І ўсё ж



чаму былы гараджанін рашыўся перабрацца на вёску, дзе, як ён сам жартуе, работа летам — з пяці да дзевяці, а ўзімку з дзевяці да пяці?

— Мяне задавальнае мая самарэалізацыя. Я бачу, як мяняецца зямля, як яна працуе. У ліпені тут такое раздолле птушак, казурак... Пачынаеш разумець, які след можа пакінуць чалавек. Важна, каб гэта была не выпаленая хімікатамі зямля, а нешта іншае. А вось фінансавым бокам сёння я пакуль не задаволены. Гэта не тыя грошы, якіх дастаткова для выплаты даўгоў. Думаю, што разлічуся з пазыкамі за пяць гадоў і тады выйду на заробак, які дазволіць далей развівацца. Гэта дарагое хобі.

Сельская гаспадарка — адна з самых павольна акупаемых і капіталаёмістых галін. Напрыклад, арганічнае насенне даводзіцца купляць за мяжой, бо такога ў Беларусі не вырабляецца. Семечка памідора можа каштаваць і пяць капеек, і адно еўра.

У Беларусі Дзмітрый атрымаў эканамічную спецыяльнасць, а пасля яшчэ вучыўся ў Швецыі на кансультанта па арганічным земляробстве. Калі быў на практыцы ў шведскай сям'і, заўважыў: людзі, якія працуюць на ферме, трымаюць 25 малочных кароў, жывуць у вёсцы за сем кіламетраў ад найбліжэйшага гарадка, не пазбаўлены звычайных радасцяў жыцця. Яны ездзяць у рэстаран, тэатр, кафэ... І Дзмітрый упэўнены, што гаспадарку трэба арганізаваць такім чынам, каб не сядзець у градах ад цямна да цямна. У Еўропе нават ёсць такое паняцце, як падменны фермер — ён прыязджае на выхадныя ці на тыдзень і адпускае людзей у нармальны адпачынак. Што перашкаджае паспрабаваць гэта і ў нас? Ды і стварыць добрыя бытавыя ўмовы сёння ў вёсцы — не праблема.



Не трэба думаць, што атрымаўшы ў Швецыі веды — гатовая шпаргалка. Галоўнае — яны далі разуменне, што арганічная гаспадарка — гэта цэласная сістэма. У арганіцы гаспадары кормяць не канкрэтныя культуры, а глебу, фарміруюць яе ўрадлівасць. Важна навучыцца выбіраць культуры — не мона-, а разнастайныя, не забывацца на шматгадовыя расліны, каб было дзе жыць карысным насякомым і птушкам.

Гаспадар, у якога расце «чыстае» (так прадукцыю фермера называюць мясцовыя жыхары), прызнаецца, што яму даводзіцца пастаянна шукаць інфармацыю праз інтэрнэт, быць і аграномам, і спецыялістам па абароне і сілкаванні раслін, бо ўсе нюансы прадбачыць немагчыма.

На жаль, і вытворцы насення не даюць гаспадарам падказак, не пазначаюць на пакетах, да якіх хвароб уразлівыя пэўныя сарты. Расліны могуць быць розныя і па сіле росту, форме лістоў. Так, калі фермер працуе са свежым рынкам, яму важна паставіць у сезон якасную прадукцыю — напрыклад, радыс са здаровым, прыгожым бацвіннем.

## Шляхі да экаежы

— І ўсё ж: што ў нас трэба зрабіць, каб арганічнае земляробства развівалася? — цікаўлюся ў гаспадара з Бярозаўскага раёна.

— Жаданне дзяржавы бачыць, як яно развіваецца. Неабходна, каб замест стаўлення да экафермераў «ну, няхай будуць» з'явілася ўстаноўка «трэба, каб былі!» Калі абмяркоўваўся будучы закон аб арганічным земляробстве, Мінфін напісаў рэкамендацыі, што ўсё гэта не павінна пацягнуць расходавання бюджэтных сродкаў. Але каб нешта развівалася, трэба хоць неяк такой справе садзейнічаць. Гэта можа быць сертыфікацыя, падатковыя стаўкі, ільготнае фінансаванне.

— У еўрапейскіх краінах арганічных фермераў падтрымліваюць. Напрыклад, больш ахвотна і пад меншы працэнт даюць крэдыты. І людзі пераходзяць на такую форму гаспадарання не толькі з-за ідэі, але і таму, што гэта выгадна, — заўважае Лана Семенас. — Мне падаецца, што інтэнсіўныя фермеры, якія забруджваюць прыроду і ў якіх менш якасная прадукцыя, павінны плаціць падатак, які б мог выкарыстоўвацца на развіццё экалагічных формаў гаспадарання. Фінансавая падтрымка асабліва патрэбная арганічным фермерам у пачатку. Ёсць такое паняцце, як «пераходны перыяд», калі ўсе нормы арганічнай сельскай гаспадаркі выконваюцца, але пакуль прадукцыя не мае арганічнага знака. У такі час аграэкасістэма можа стаць больш урадлівай, напрыклад, можа з'явіцца больш шкоднікаў ці panізіцца ўраджайнасць. І важна дапамагчы фермеру пераадолець усе складанасці.

Для развіцця арганічных гаспадарак спатрэбяцца падрыхтаваныя пад гэту галіну аграномы, заатэхнікі і іншыя спецыялісты. І навучаць кадры павінны не толькі грамадскія арганізацыі, як гэта робіцца цяпер, але і дзяржаўныя навучальныя ўстановы.

Вядома, трэба, каб і попыт на арганічную ежу стаў большы. Сёння большасць беларусаў кіруюцца цэнамі. І пакуль мы не раскруцілі моду на здароўе, рана чакаць, што людзі кінуцца набываць арганічную прадукцыю, даражэйшую часам і ў некалькі разоў. Галасаваць рублём за арганічныя садавіну, агародніну ці жывёлагадоўлю трэба не толькі дзеля ўласнага здароўя — так мы клапоцімся пра большае. Побач з экагаспадаркамі становяцца чыстымі вада і глеба, павялічваецца біяразнастайнасць. (Невялікая ж прэс-тур арганізаваны ў межах праекта, што фінансуецца Шведскім агенцтвам па міжнародным развіцці і супрацоўніцтве і Кааліцыяй «Чыстая Балтыка».)

## Спакуса агароднікаў

— Усюды, дзе бываю, каштую буякі. Але такіх смачных, як нашы, нідзе не сустракала. Усё таму, што арганічных буякаў амаль нідзе няма, усюды інтэнсіўныя, — кажа **намеснік кіраўніка сялянскай фермерскай гаспадаркі «СідСад» Алена СІДАРАВА.** — Калі на расліну выліць фунгіцыд, ягады набудуць ледзь улоўны водар, вы яго, магчыма, і не адчуеце, а я адразу. Часам дачнікі думаюць, што, калі набыць прэпараты, можна пазбавіцца ад усіх праблем у садзе. Так, апрацаваныя расліны, магчыма, і не захварэюць, але можа захварэць чалавек.

Ужо дваццаць гадоў Алена з мужам жывуць «з зямлі». Спачатку займаліся агароднінай і духмянымі травамі. Пачыналі спасцігаць сакрэты аграрнага бізнесу з цяпліцы і прысядзібнай гаспадаркі, а пасля рашыліся ўзяць участак. Хацелі апрацоўваць пяць гектараў, а «падвярганіся» ўсе 40, прычым брацы іх трэба было цалкам.

— Да нас ад гэтай зямлі адмовілася, можа, чалавек дванаццаць, людзі бачылі гэты ўзгорысты ўчастак і адразу пралічвалі, як многа давядзецца ўкласці працы і грошай. А мы, калі трапілі сюды, адразу закахаліся ў гэта месца! — дзеліцца гаспадыня.

Сёння гаспадарка вырабляе суніцы, бружмель, журавіны, памідоры, агуркі, цукіні, гарбузы, перцы, курыныя яйкі.

Неяк у межах адукацыйнага праекта гаспадары паехалі па вопыт да галандскіх фермераў. Там упершыню пакаштавалі буякі і вырашылі, што гэта тая навінка, якую трэба запускаць у Беларусі. Так агароднікі сталі яшчэ і садаводамі. Сёння сужэнцы апрацоўваюць палі больш чым у 60 гектараў. Яны маюць 10 пастаянных работнікаў. Нават сабраць ураджай — цэлая навука. Важна падгадаць з часам, калі буякі паспелі, з надвор'ем і яшчэ ведаць, як адрываць ягаду, каб не пашкодзіць. Тут вельмі многа ручной працы. Буякі — культура капрызлівая.

Сёння фермерам трэба пралічваць сітуацыю такім чынам, каб не працаваць са стратамі. Прыгадаем сёлетнія праблемы, калі нарыхтоўшчыкі давалі за ягады «смешныя» грошы. «Мы ездзілі ў Сербію, каб убачыць, з чым сутыкнуліся фермеры, якія вырошчваюць буякі і экспартуюць іх у тым ліку ў Расію і Беларусь. Цэны ўпалі да ўзроўню 0,8 еўра за кілаграм. Гэта ніжэй за сабекошт. Каб вырасціць кілаграм ягады, трэба не менш за 3 еўра, — дзеліцца Алена. — А вось арганічная прадукцыя ў Еўропе ў эканамічным плане менш рызыкоўная. Попыт на яе на Захадзе расце, людзі гатовы больш плаціць за «чыстую» ежу. І калі ў Еўрасаюз практычна немагчыма прадаць прадукты інтэнсіўнай сельскай гаспадаркі, дык для «арганікі» рынак адкрыты».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ,**
**фота аўтара.**

Будзь у курсе!

## «Рыбалка па правілах»

**Прафілактычная акцыя пад такой назвай стартавала 1 кастрычніка і будзе доўжыцца да снежня, паведамілі ў рэспубліканскім дзяржаўна-грамадскім аб'яднанні «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» (БТПР).**

Работнікі БТПР сумесна з супрацоўнікамі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь арганізуюць узмоцнены кантроль за выкананнем правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства.

Асаблівая ўвага пры правядзенні рэйдавых мерапрыемстваў будзе аддадзена выкананню правілаў лоўлі рыбы на кружкі, калабашкі, донкі, на дарожку з суднаў з рухавікамі, а таксама падтрыманню рыбаловамі належнага санітарнага стану ўгоддзяў.

Рыбаловам дазваляецца выкарыстоўваць прылады аднаго або розных відаў з агульнай колькасцю кручкоў не больш за пяць штук на чалавека. Выключэнне складаюць рыбаловы — члены РДГА «БТПР», якім дазволена выкарыстоўваць да дзесяці кручкоў. Акрамя таго, лавіць рыбу на дарожку з суднаў з рухавікамі і займацца падводным паляваннем маюць права толькі рыбаловы, якія з'яўляюцца членамі БТПР.

Рыбаловы, якія парушылі правілы, нясуць адміністрацыйную, крымінальную або іншую адказнасць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

www.girza.by



Рассекатели веток «СЕКАЧ» и щепорезы «ДРОБНЯК» для переработки древесных отходов в дешевое топливо под пиролизные и твердотопливные котлы, камины, печи.
Производим и поставляем продукцию согласно запросу каждого клиента.




Работаем по всей территории РБ.
УНП 691586696



Тел. 8(029) 675 18 75

Спецыяльны рэпартаж

# ВАМ — ЛІСТЫ

## Як сартуюць паштовыя адпраўленні?

**Амаль усе лісты ў нашай краіне праходзяць праз сталіцу. А дакладней кажучы, праз цэх пісьмовай карэспандэнцыі і гібрыднай пошты вытворчасці «Мінская пошта». Знаходзіцца ён таксама ў сімвалічным месцы — у самым цэнтры галоўнага горада нашай краіны. Сарціроўка адбываецца кругласутачна ў тры змены. Ды і рамкі па часе пастаўлены жорсткія. Бо ад гэтага залежыць, як хутка па Беларусі раз'едуцца паштовыя грузавікі...**



Марыя БАБІНОВІЧ — аператар сувязі цэха пісьмовай карэспандэнцыі і гібрыднай пошты вытворчасці «Мінская пошта» РУП «Белпошта».

— Памятаеце, раней на канвертах і паштоўках была цэлая інструкцыя аб тым, як трэба правільна пісаць лічбы індэкса? — пытаецца **намеснік начальніка вытворчасці «Мінская пошта» Тамара ДЗЕРБАН.** — Гэта было важна для яшчэ савецкага сартавальнага абсталявання. Распазнаць друкаваныя літары і тым больш рукапісныя ў графах «Каму» і «Куды» было для тагачасных тэхналогій звышнатуральнай задачай. А вось «навучыць» машыну ідэнтыфікаваць лічбы, намаляваныя па кропачках, аказалася больш пасільным. Ды і тое вялікую колькасць работы даводзілася рабіць уручную. Праведзены не там штрышок або напісаная не так лічба тут жа «выбівала» памылку.



Вольга САСІНОВІЧ — аператар сувязі цэха пісьмовай карэспандэнцыі і гібрыднай пошты вытворчасці «Мінская пошта» РУП «Белпошта».

Сучаснае ж абсталяванне з'явілася на «Мінскай пошце» параўнальна не так даўно — у 2012 годзе. Але нагрузка на яго істотная. Спецыялісты падлічылі, што за суткі праз цэх праходзіць у сярэднім каля 90 тысяч паштовых адпраўленняў. Калі ўзважыць такую масу лістоў, то яна будзе складаць крыху менш за паўтары тоны. А, напрыклад, перад навагоднімі святамі гэтую колькасць можна смела множыць удвая.

— Але ў машыну трапляць не ўсе лісты. Напрыклад, існуе абмежаванне па таўшчыні. І яно даволі істотнае — да шасці міліметраў. Усё, што перавышае гэты паказчык, у тым ліку і дробныя пакеты, — ідзе на ручную апрацоўку. Канверты фармату А4, дарэчы, таксама адпраўляюцца выключна туды.

Працэнт аўтаматычнай сарціроўкі даходзіць да 70. Яго можна павялічыць, балазе запас ёсць. Але мяч у гэтым выпадку на баку тых, хто адпраўляе лісты.



— Нярэдка здараецца так, што наша машына не можа карэктна распазнаць адрас і правільна яго суаднесці з патрэбнай ячэйкай, якая адпавядае рабочаму ўчастку, — заўважае **начальнік цэха пісьмовай карэспандэнцыі і гібрыднай пошты вытворчасці «Мінская пошта» Аксана ЗУЕЎСКАЯ.** — Прычын тут, як правіла, дзве. Першая — гэта арфаграфічныя памылкі ў адрасе. Напрыклад, што да Мінска, то праспект Любімава не раз ператвараўся ў праспект Любімага. Але такога наймення не існуе ў рэальнасці! А яшчэ ў чалавека можа быць неразборлівы почырк. У такім выпадку «праблемныя» лісты адпраўляюцца на відэакадзіраванне. Пры дапамозе спецыяльнага праграмнага забеспячэння адрас на маніторы павялічваецца шматкроць, што дапамагае правільна зразумець літары. Але гэта магчыма не заўжды. У 10 % выпадкаў бяссільнае і яно. У такім разе загадкавае адпраўленне аддаюць да спецыялістаў, якія займаюцца ручной сарціроўкай. Аднак кожны дзень застаецца лістоў дзесяць, дэшыфраваць почырк на якіх не пад сілу і ім. Тады іх вяртаюць па адрасе, з якога было зроблена адпраўленне.

Цікава, што датычна карэспандэнцыі, якую адпраўляюць юрыдычныя асобы, такой праблемы амаль не існуе. Справа ў тым, што яны, як правіла, на канвертах усю неабходную інфармацыю друкуюць. І таму толькі адзін ліст з сотні не пройдзе з першага разу аўтаматычную сарціроўку, ды і тое гэта звязана з тым, што, напрыклад, у адпраўшчыка быў вельмі бледна надрукаваны адрас.

— Новая карэспандэнцыя паступае ў цэх пісьмовай карэспандэнцыі і гібрыднай пошты ўвесь час на працягу дня, — кажа Тамара Дзербан. — У нас па Мінску працуюць 20 маршрутаў выемкі па 509 паштовых скрынях. Калі кіроўца сабраў пошту, то прыязджае і здае свае набыткі. З аддзяленняў паштовай сувязі да нас прывозяць пошту два разы на дзень. А вось з абласцей — раз на суткі. І адтуль паступленні бываюць выключна ў мяшках.

Што да ранжыравання па часе адпраўлення машын, то яно вельмі жорстка рэгламентавана. Спачатку адпраўляецца карэспандэнцыя ў абласныя цэнтры. У мінскія паштовыя аддзяленні рэйсы пачынаюцца бліжэй да раніцы. Справа ў тым, што адначасова з лістамі, пасылкамі і дробнымі пакетамі аўтамабілі вязуць і перыядычныя друкаваныя выданні. А такая істотная розніца ў часе абумоўлена адлегласцю.

А вось паштовых вагонаў у Беларусі ўжо не сустрэнеш. Яны былі вельмі актуальныя ў часы СССР — паспрабуйце даставіць самалётамі вал паштовых адпраўленняў у Сібір ці наогул на Далёкі Усход. Цяпер жа на такія вялікія адлегласці наша пошта не працуе, а для ўнутрырэспубліканскіх перавозак плаціць за карыстанне вагонам нявыгадна ў параўнанні з выдаткамі на аўтамабільны транспарт. Ды і не ў кожны райцэнтр праведзены рэйкі, а гэта значыць, што ўсё роўна перагрузка на машыны спатрэбіцца. Праўда, міжнародныя паштовыя вагоны існавалі яшчэ не так даўно. Напрыклад, адзін такі вагон курсіраваў з Мінска ў Іркуцк. Цяпер жа ўся міжнародная пошта апрацоўваецца да бюро абменаў. Гэта азначае, што калі вы пасылаеце ліст, напрыклад, у той самы Іркуцк, то спярша яго адвязуць у Маскву на аўтамабілі.

Часцей за ўсё беларусы пасылаюць лісты ў краіны Балтыі, Расію, Украіну. А што да ўваходнай пошты, то тут безумоўны лідар — Кітай. Больш за ўсё адтуль ідзе дробных пакетаў — інтэрнэт-гандаль набірае абароты. Але даволі шмат адпраўленняў прыходзіць да нас з ЗША, Германіі, Італіі і нават Сінгапура. Штодня рэгіструюцца пасылкі і лісты з даволі экзатычных для нас краін — напрыклад, з Бангладэш. Праўда, лісты, падпісаныя на лацініцы, адправяцца на ручную сарціроўку: абсталяванне «заточана» на кірыліцу з прычыны таго, што пераважная большасць карэспандэнцыі ў нас усё-такі ўнутрырэспубліканская.

Вядучы інжынер-электронік Сяргей Коптыш дэманструе, як працуе сучасная сартавальная машына. Аператар націсне на пульце некалькі кнопак — і шчыльна састаўленыя лісты схаваюцца за металічным корпусам, каб праз некалькі секунд размясціцца на патрэбным дастаўчым участку.

— Можна выставіць хуткасць падачы, адлегласць паміж лістамі. Камера робіць да 45 тысяч карцінак у гадзіну ў вельмі высокім раздзяленні. Яны пасля трапляюць на сервер, дзе апрацоўваюцца крыптаграфічным праграмным забеспячэннем. Калі інфармацыя расшыфравана — ліст адпраўляецца ў прыгатаваную для яго ячэйку, якая разлічана на 600 лістоў. Калі не — то ён ідзе на відэакадзіраванне, дзе 25 аператараў апрацоўваюць атрыманыя карцінкі. Пры паўторным прагоне лістоў машына чытае інфармацыю, якую прысвоіў аператар відэакадзіравання. Пры любой нештатнай сітуацыі — напрыклад, два лісты намоклі і счапіліся паміж сабой, — машына спыніцца, а на маніторы будзе бачна ўзніклая праблема.

У планах «Белпошты» — набыць сартавальнае абсталяванне для апрацоўкі дробных пакетаў і невялікіх пасылак.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**



Кацярына ТОЗІК — аператар сувязі цэха пісьмовай карэспандэнцыі і гібрыднай пошты вытворчасці «Мінская пошта» РУП «Белпошта».



Валерыя КАНДРАЦЕНКА — аператар сувязі цэха пісьмовай карэспандэнцыі і гібрыднай пошты вытворчасці «Мінская пошта» РУП «Белпошта».



Кіра ЕРАШЭВІЧ — сартавальнік паштовых адпраўленняў і друкаваных сродкаў масавай інфармацыі цэха пісьмовай карэспандэнцыі і гібрыднай пошты вытворчасці «Мінская пошта» РУП «Белпошта».

Стужка навін

### Віктарына да свята

Сёння адзначаецца Сусветны дзень пошты. Гэтае прафесійнае свята ўпершыню было ўстаноўлена адмысловым паштовым кангрэсам, які прайшоў у Токія роўна паўстагоддзя таму. Зроблена гэта было ў гонар гадавіны стварэння Сусветнага паштовага саюза, які адлічвае сваю гісторыю з 1874-га. Увесь гэты час структура планетарнага маштабу аказвала магутную падтрымку ў прагрэсе паштовых паслуг, цалкам была зменена лагістыка.

І вось да гэтай даты «Белпошта» запрашае ўсіх ахвотных у выдзеленыя аддзяленні паштовай сувязі ўсёй краіны. Супрацоўнікі прадпрыемства падрыхтавалі для наведвальнікаў пазнавальныя пытанні, якія будуць датычыцца гісторыі пошты і паслуг, якія яна аказвае. Удзельнікі віктарыны, якія правільна адкажуць на пытанні, атрымаюць у якасці прызоў сувеніры.

Поўны спіс такіх аддзяленняў даступны на сайце «Белпошты». У Мінску ж віктарына пройдзе ў аддзяленні сувязі № 13 (якое месціцца па вуліцы Коласа, дом 31) з 10 да 11 гадзін. Другім пунктам абраны паштамт. Там віктарына будзе праходзіць з 16 да 18 гадзін. Не прапусціце такую магчымасць!

### Павіншуйце матулю

Цяпер у краіне праходзіць Тыдзень маці. Да гэтай даты ў выдзеленых аддзяленнях паштовай сувязі па ўсёй рэспубліцы праходзіць акцыя «Павіншуем маму разам!». Наведвальнікі змогуць набыць паштовыя карткі, напісаць цёплыя радкі сваім любімым мамам і павіншаваць іх з будучым святам. Паштоўкі дойдуць да сваіх адрасатаў бясплатна.

### У Мінску сустрэліся посткросеры

Абмен паштоўкамі з адрасатамі па ўсім свеце набірае ў нашай краіне папулярнасць. Нашы карткі дазваляюць расказаць жыхарам іншых краін пра беларускі фальклор, нацыянальныя строі, святы, абрады, творы мастацтва, помнікі архітэктуры, славутых людзей... Да канца гэтага года «Белпошта» плануе выпусціць некалькі сюжэтаў на тэму гісторыі пошты, грашовых знакаў Беларусі, флоры і фаўны... І канешне ж, не застанецца па-за ўвагай навагодняя тэматыка.

І вось напярэдадні Сусветнага дня пошты ў прасторы музея архітэктурных мініяцюр «Краіна міні» сабраліся 53 посткросеры з усёй Беларусі. Самым юным з іх было ўсяго 10 і 11 гадоў! Дзве дзяўчынкі атрымалі падарункі ад арганізатараў.

### Махляры актывізаваліся

Чароўнае слова «выйгрыш» ласкае вушы, песціць зрок і... часам перадае асабістыя звесткі ў рукі інтэрнэт-махляроў. Так, карыстальнікі электроннай пошты пачалі атрымліваць паведамленні, адпраўленыя нібыта ад імя «Белпошты». У іх паведамляецца пра выйгрыш новага смартфона. А каб атрымаць нечаканы падарунак, адпраўшчыку прапануюць выбраць падарункавую каробку, пасля перайсці па спасылцы, пацвердзіць свае звесткі і пералічыць пяць рублёў за дастаўку.

«Белпошта» адзначае, што ніякіх розыгрышаў каштоўных прызоў яна не праводзіць. Такім чынам невядомыя махляры атрымліваюць не толькі грошы, але і пашпартныя дадзеныя. У якіх мэтах яны іх выкарыстаюць — невядома.

Пра ўсе акцыі нацыянальны паштовы аператар паведамляе выключна на сваім сайце belpost.by.

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Пуховичский пищекомбинат» в лице антикризисного управляющего Боброва Д. А. в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

| № п/п | Наименование объекта | Инвентарный номер согласно данным бухучета | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка (10 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| ЛОТ № 1 | | | | |
| | Комплекс имущества | | **3 330,00** | **333,00** |
| Недвижимое имущество | | | | |
| 1 | весовая с навесом общей площадью 12,3 кв. м инв. № 602/С-55872, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 624450100001001028 площадью 3,7321 га по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, пер. Калинина М. И., 3 | | 2 550,00 | |
| Оборудование | | | | |
| 2 | Весы автомобильные механические РС-30Ц13А, заводской № 10455 | | 780,00 | |

Стоимость снижена на 50 %.

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.**

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

– заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

– для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

– для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

– для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

– для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 31.07.2019.

Аукцион состоится **24.10.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.10.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению государственного учреждения «Дворец культуры имени М. Горького» (продавец), проводит открытый аукцион **права заключения договора аренды изолированного помещения (нежилого) общ. пл. 50,6 кв. м, расположенного на 1-м этаже здания дворца культуры (инв. № 610/С-13856) по адресу: Минская область, г. Борисов, пр. Революции, 49, для размещения пункта общественного питания (кафетерия) с режимом работы с 10.00 до 21.00.**

| | |
|---|---|
| Общая площадь, кв. м | 50,6 |
| Срок договора аренды | 1 год |
| Условия | Победитель аукциона обязан провести текущий ремонт помещения без возмещения затрат |
| Земельный участок, на котором рас-полагается Объект | Кадастровый номер – 640400000010000725, пл. 2,2190 га |
| Начальная цена права заключения договора аренды, бел. руб. | 213,79 руб. |
| Сумма задатка, бел. руб. | 21,38 |
| Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта | 37,95 базовой арендной величины |

Базовая арендная величина с 01.04.2019 составляет 16,90 бел. руб. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

**Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта, перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства. Аукцион состоится **12.11.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.11.2019** до **17.00** по указанному адресу. **Тел: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17, сайт в сети интернет: www.rlt.by**

# ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион Организатор торгов: ЗАО «Белреализация» (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690-54-09, BELTORGI.BY

Продавец: ООО «Ювелирный завод «Эгретт» (УНП 700294886) в лице управляющего по банкротству частного предприятия «Антикризисная перспектива», тел. + 375 (29) 628-00-68.

Повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены: **24 октября 2019 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Вставки синтетические в ассортименте | 4 548,55 |
| 2 | Серебряные изделия в ассортименте (925 проба) в ассортименте | 13 632,04 |
| 3 | Серебряные изделия (925 проба) в ассортименте | 2 194,128 |
| 4 | Серебряные изделия (925 проба) в ассортименте | 387,864 |
| 5 | Серебряные изделия (925 проба) в ассортименте | 63 835,18 |
| 6 | Золотые изделия (585 проба) в ассортименте | 58 689,17 |
| С полным перечнем предметов торгов можно ознакомиться на beltorgi.by | | |

Местонахождение предметов торгов – г. Могилев, контактный телефон для ознакомления и осмотра +375 29 687 66 09.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 23 октября 2019 г. 17.00** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 05.09.2019 г.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «Брестское отделение Бел. ж. д.» Локомотивное депо Брест

<table>
<tr><th>Наименование и местоположение объекта</th><th>Общая площадь, кв. м</th><th>Целевое назначение</th><th>Сумма арендной платы, БАВ</th><th>Начальная цена продажи, руб.</th><th>Сумма задатка, руб.</th></tr>
<tr><td>ЛОТ № 1 – помещение площадью 24,4 кв. м, расположенное в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-26447 (наименование: здание гаража; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта) по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Герцена, 73Б</td><td>24,4</td><td rowspan="2">Хранение машин и механизмов; хранение непродовольственных товаров (кроме взрывоопасных и легковоспламеняющихся); оказание услуг по обслуживанию и ремонту автомобилей</td><td>21,96</td><td>103,09</td><td>10,31</td></tr>
<tr><td>ЛОТ № 2 – помещение площадью 24,3 кв. м со смотровой ямой 5,5 кв. м, расположенное в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-26447 (наименование: здание гаража; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта) по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Герцена, 73Б</td><td>24,3 со смотровой ямой 5,5</td><td>21,87</td><td>125,91</td><td>12,59</td></tr>
<tr><td>Продавец</td><td colspan="5">Локомотивное депо Брест, Брестская обл., г. Брест, ул. Скрипникова, 135, УНП 200274028 тел. 80162261963</td></tr>
<tr><td>Организатор аукциона</td><td colspan="5">РУП "Институт недвижимости и оценки" Брестский филиал</td></tr>
<tr><td>Реквизиты для перечисления задатка</td><td colspan="5">р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО "БПС-Сбербанк". Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245</td></tr>
<tr><td>Условия</td><td colspan="5">1. Срок аренды – 3 (три) года.<br>2. С победителем аукционных торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней будет заключен договор аренды.<br>3. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка.<br>4. Возместить Организатору аукциона расходы по их проведению в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона</td></tr>
<tr><td colspan="6">Аукцион состоится <u>12 ноября 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325</u></td></tr>
<tr><td colspan="6">Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, и иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81</td></tr>
<tr><td colspan="6">Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. № 624, от 23.09.2011 г. № 431, от 10.01.2013 г. № 14) – 10 базовых величин</td></tr>
<tr><td colspan="6"><u>Последний день приема заявлений</u> – 11 ноября 2019 г. до 17.00</td></tr>
</table>

# Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и права частной собственности на земельный участок для обслуживания не завершенного строительством жилого дома в г. Гродно (микрорайон «Зарица-2») 12 ноября 2019 года

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе начальная цена не завершенного строительством капитального строения), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Вир, д. 8 | 440100000003000212 | 0,1141 | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, количество надземных этажей – 1, количество подземных этажей – 1, общая площадь здания 300,4 кв. м, готовность 45 %, вид конструкции здания – бескаркасная, материал наружных стен – железобетонные изделия, фундамент – железобетонные блоки, внутренние стены – блоки газосиликатные, перегородки – кирпичи, перекрытия – дерево | 63,75 | 62 650,35 (46 084,89) | 12 500,00 |

* - Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения. Канализации, электроснабжения. Точки подключения определяются проектом. Земельный участок имеет ограничения.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с и решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

Аукцион состоится 12 ноября 2019 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 ( актовый зал).

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 с 14 октября по 6 ноября 2019 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, а также градостроительный паспорт земельного участка (при наличии).

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 37, 72 00 10,**
**официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by, gcn.by**

Чалавек — чалавеку

# ВЫТОКІ НАДЗЕЙ,

## або Самае страшнае — гэта... страх



**Часам думаю: якое ж непрадказальнае наша жыццё! Раніцай прачынаешся, радуешся сонцу, новаму дню, плануеш, што трэба зрабіць... Нешта не так са здароўем? «Ды пройдзе, — думаеш, — такой бяды». А потым трапляеш да ўрачоў, ідзеш на сур'ёзнае абследаванне і чуеш, што гэтым разам, не, на жаль, не пройдзе. Як гром сярод яснага неба: «У вас анкалогія».**

Ад гэтай навіны адразу цьмянее ў вачах: нічога больш не хочацца і нішто не радуе. У галаве застаецца толькі адно: гэта канец.

Навукова даказана, што няма нічога страшнейшага, чым... сам гэты страх.

Але ж на змену яму проста павінна прыйсці рашучасць: нельга, сорамна паддавацца настрою, панікаваць (а тым больш чалавеку даросламу), трэба збірацца з сіламі і дзейнічаць. На дварэ дваццаць першы век, ёсць спецыялісты, якія могуць дапамагчы, ёсць Усявышні, які чуе людскія малітвы, ёсць, урэшце, анкахворыя, якія пасля аперацый (часам не адной і не дзвюх), пасля шматлікіх сеансаў хіміятэрапіі і апраменьвання гадамі, нават дзесяцігоддзямі жывуць, гадуюць дзяцей і ўнукаў, працуюць, забываюцца на хваробу...

Як мне асабіста, дык нават прыклады прыводзіць не трэба. Я сама, так бы мовіць, праходзіла ўжо за шлагбаум: на тэрыторыю Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі — хварэла, лячылася і пасля гэтага, дзякаваць богу і людзям, трыццаць (!) гадоў пражыла.

...Цяпер у тым самым цэнтры да непазнавальнасці ўсё змянілася: не ведаю, добра гэта ці дрэнна, але ж вырас цэлы горад у горадзе. У «абдымках» сасновага бору і старыя, ужо знаёмыя мне карпусы, і зусім новыя, па-сучаснаму абсталяваныя... Там жа — паліклініка, «сад мудрасці», які нават сёння радуе мноствам кветак, прыгожыя лавачкі, якія «падказваюць» тым, хто прысядзе: «я — шчаслівы», «я — любімая», «я — здаровая». І гэта неяк міжволі падтрымлівае надзею...

Аднак галоўнае — гэта, вядома ж, людзі, выратавальнікі чалавечых жыццяў: дактары, навукоўцы, медсёстры, нянечкі, для якіх іх нялёгкая праца — як суд перад богам. Магчыма, таму на сталах амаль у кожным кабінеце стаяць іконы, а на самой тэрыторыі — невялікі храм, куды заўсёды можна зайсці...

Адзначаючы шматлікія перамены на тэрыторыі і ў рабоце цэнтра, не магу не ўспомніць, што іменна тут мне пашчасціла пазнаёміцца са сваіцілам сусветнага маштабу ў галіне анкалогіі, доктарам медыцынскіх навук Кацярынай Яфімаўнай Вішнеўскай. Усіх званняў і ўзнагарод гэтай цудоўнай жанчыны, мусіць, не злічыць, а вось іншае — і можна, і, вядома ж, трэба. Кацярына Яфімаўна (светлай памяці!) падарыла месяцы, гады, а то і дзесяцігоддзі шчаслівага жыцця мноству жанчын (у тым ліку і мне), напісала дзясяткі кніг па анкагінекалогіі, пакінула цудоўных вучняў, сярод якіх 23 кандыдаты навук.

Дарэчы, адна з вучаніц, урач-хірург Таццяна Віталеўна Осіпава працуе ў паліклініцы інстытута анкалогіі. Як спецыяліст, па водгуках хворых, мае вельмі высокі рэйтынг.

Успомніла я незабыўную Кацярыну Яфімаўну і пасля кароткай размовы з загадчыцай лабараторыі рэканструктыўна-аднаўленчай хірургіі, доктарам медыцынскіх навук Нінай Мікалаеўнай Ахмед, бо ўбачыла той жа, найвышэйшай пробы, прафесіяналізм, тую ж увагу да пацыента і жаданне дапамагчы.

Іншымі словамі, праз 30 гадоў зноў апынуўшыся «за шлагбаумам» цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, сустрэлася з сапраўднымі прафесіяналамі, да якіх з усіх куткоў Беларусі і нават з-за межаў спяшаюцца хворыя (шмат хворых) — з надзеяй на дапамогу.

Дай бог ім веры ў тое, што гэта спраўдзіцца!

**Н. Л.** *Бярэзінскі раён.*

Дзякуй!

# ХТО СА «ЗВЯЗДОЙ» СЯБРУЕ, ТАМУ І ШАНЦУЕ

**Больш за 30 гадоў я з'яўляюся пастаянным падпісчыкам «роднай газеты на роднай мове» і гэткім жа заўсёдным удзельнікам усіх звяздоўскіх латарэй, гульняў і розных конкурсаў. Прычым на мэце не столькі ў іх нешта выйграць... Мне цікавы сам «працэс»: розыгрыш, чаканне вынікаў, спісы шчасліўчыкаў... Хоць, што казаць, убачыць сярод прозвішчаў і сваё — таксама прыемна.**

Першым прызам, на які мне калісьці пашчасціла, быў унутраны замок да дзвярэй. Патрэбная рэч, але ж ехаць па яе мне зусім не выпадала. Таму я папрасіў пляменніка (на той час студэнта БДУ), каб ён завітаў у рэдакцыю... Хлопец паслухаўся — атрымаў мой выйгрыш, але якраз у той самы дзень яго сябры па інтэрнаце згубілі апошні ключ ад пакоя. А паколькі гэта з імі было не ўпершыню, камендант сказаў сваё рашучае «досыць»: маўляў, новы замок купляйце самі.

Грошай на гэта ў хлопцаў не было, а вось замок быў, хоць і мой...

Такім чынам звяздоўскі прыз «прапісаўся» ў інтэрнаце, дзе, можа, і цяпер яшчэ выконвае сваю пачэсную функцыю — захоўвае маёмасць студэнтаў.

Другі раз у звяздоўскай латарэі мне пашчасціла выйграць кухонную машыну, у трэці — мабільны тэлефон.

Была яшчэ і дубовая бочка, з якой мяне затрымалі на ўваходзе ў метро...



А ў апошнім розыгрышы я выйграў рукамыйнік з электрычным падагрэвам вады. Вельмі добрая, зручная рэч, аднак на лецішчы ў нас такая ўжо ёсць (перайшла ў спадчыну ад жончыных бацькоў), таму гэты, звяздоўскі рукамыйнік, мы вырашылі перадаць нашай Свята-Узнясенскай царкве. Будавалася яна дванаццаць гадоў і, так бы мовіць, у складчыну: на сродкі прыхаджан, спонсараў, адлічэнняў ад прадпрыемстваў і арганізацый горада і раёна. А цяпер да гэтай справы прычыніўся і «Звязда».

**Валерый Гаўрыш,** *г. Чавусы.*

Рэха

# І ЗНОЎ ПРА НАСТАЎНІКАЎ І ВУЧНЯЎ

**Напрыканцы верасня ледзь не ўся краіна абмяркоўвала абуральную гісторыю канфлікту, які адбыўся ў адной са школ Гомеля. Гаварылі пра яго і ў нас. Мне, школьніку, было цікава: што канкрэтна? Я нават правёў невялікае апытанне, на падставе чаго змог прыйсці да высновы, што думкі з нагоды істотна разыходзяцца і ў многім залежаць ад узросту тых, каго я апытваў.**

Такім чынам, людзі старэйшыя кажуць, што выхоўваць дзяцей сёння вельмі складана, што існуе так званы чалавечы фактар, і настаўніцу, якая «сарвалася», можна зразумець. Але з іншага боку галоўныя рысы педагогаў — гэта выхаванасць, стрыманасць, адукаванасць, і надзелены імі спецыяліст, якія б знешнія ці ўнутраныя фактары на яго не ўплывалі, не будзе зрываць свой гнеў на вучнях, ужываць нецэнзурную лексіку. Педагог на тое і педагог, каб заўсёды быць на галаву вышэйшым, каб служыць прыкладам і перш за ўсё для дзяцей.

Так лічаць старэйшыя настаўнікі.

Маладзейшыя сыходзяцца ў асноўным на тым, што ў згаданым канфлікце праўда на баку педагога, бо яна таксама чалавек і зразумець яе паводзіны цалкам магчыма: дзеці абавязаны годна паводзіць сябе і ў школе, і па-за ёй, паважаць настаўнікаў...

Большасць вучняў перакананы ў тым, што ў гісторыі з Гомеля нельга шукаць вінаватых, бо і вучань, і настаўнік у гэтай сітуацыі паводзілі сябе няправільна, што і прывяло да такіх маштабных узрушэнняў.

Іншымі словамі, у ходзе зносін не абысціся без узаемнай павагі. Калі яна будзе, колькасць канфліктных сітуацый абавязкова зменшыцца.

**Іван Мазурук,**
**вучань 10 класа**
**Амелянецкай СШ,**
*Камянецкі раён.*

Ад прадзедаў...

# Аб чым гамоніш, родны лес

**Да драбніц знаёмай сцяжынай кіруюся ў лес. Некалі даўно — а помніцца так светла і выразна, быццам учора — я, малы, хадзіў туды з бабуляй.**

Першае, што мы ў лесе рабілі, гэта прамаўлялі замову «ад гада паўзучага і звера ляснога». Потым мне расказвалі, куды вядзе тая ці іншая сцежка альбо дарога, вучылі арыентавацца ў лесе. У бабулі былі «ўласныя» грыбныя і ягадныя мясцінкі. Яна беражліва ставілася да кожнага дрэўца і гэтаму ж вучыла мяне.

Як кожны хлапчук, я больш любіў збіраць грыбы, а ягады — не вельмі. Але ж неяк, памятаю, мы пайшлі па чарніцы. У бабулі была кашолка літраў на восем, а я — сямігадовы — збіраў ягады ў невялікі кубак, які потым хацеў высыпаць бабулі...

Яна пахваліла мяне: маўляў, харошы хлопчык — ягадкі без лісцікаў, без іглінак, нясі іх сам.

І я панёс — трымаючы перад сабой, з форсам, аж пакуль... не зачапіўся за сасновы корань, не страціў раўнавагу: ягады чорным гарохам пасыпаліся па сцежцы.

...Вось ён, той самы корань: тады — ледзь не вораг, а цяпер чамусьці як сябра. Колькі год прамінула, а ён па-ранейшаму трымае сваю доню-сасну... Шкада, што старой бярозы няма, якую бабуля вітала нібы сваячку... І ягады збірала па правілах: найпершае было — глядзі, на чым стаіш, нахіліся, падбяры ўсё, што зверху, потым расхіні галінкі...

Журавіны хутка напаўняюць маё вядзерца. Яны зараз самыя спелыя. Дачакаліся мяне... Як некалі нас з бабуляй.

**Аляксандр МАТОШКА,** *в. Янкавічы, Расонскі раён.*

Часы і норавы

# У чым яно, тое багацце?

...Антонавіч, аўдавеўшы, не паехаў да дзяцей, гадоў з дзесяць жыў адзін — у сваёй хаце, у сваёй вёсцы. У гарэлку ніколі не ўлягаў, таму гаспадарку сваю вёў спраўна. Апроч іншага, яшчэ і па добрым парсюку штогод выгадоўваў.

Іншымі словамі, годна жыў — з людзьмі, сярод людзей. Яго шчыра паважалі суседзі, яго хату ніколі не міналі не толькі равеснікі, але і маладзейшыя вяскоўцы. Ды і сам ён любіў, што называецца, выйсці «на сяло» — пасядзець, пагаманіць...

А тут раптам моцна захварэў (якніяк дзявяты дзясятак пайшоў...), трапіў у бальніцу. І дактары, дзякаваць богу, дапамаглі — не далі памерці добраму чалавеку. Праўда, жыць аднаму больш не раілі. Ды і дачка проста не адпусціла яго ў вёску — пакінула ў сябе.

— Тут жа добра, як у раі, — казаў Антонавіч пра гарадское жыццё. — Еш, што хочаш, спі — хоць да паўдня. У кватэры цёпленька, чысценька. Дачка, як птушка, вакол віецца... Адно не магу перанесці — гэта адзіноцтва. Дзеці на работу, а я ў маркоту: то ў хаце пасяджу, то, бывае, на дварэ... І хоць бы хто калі падышоў ды загаварыў, — не. Усе чыста міма праносяцца... Або ў кватэрах сваіх пазапіраюцца і сядзяць. Пэўна, багацце сваё пільнуюць? Але ж ці ведаюць, у чым яно?..

Цяжка сказаць, ці чытаў гэты дзядуля Экзюперы. Але ж, хаваючы слёзы, марыў: «Мне б хоць на тыдзень які дадому, да сваіх людзей».

Значыць, ведаў ён, што самая галоўная раскоша ў нашым жыцці — гэта раскоша чалавечых зносін.

**Фаіна Касаткіна,** *г. Паставы.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Што ў меню?

# Восенню павінна падаць лісце, а не настрой!

## Як разнастаіць свой рацыён, каб перамагчы сезонную хандру

**ВОСЕНЬСКАЯ хандра, асабліва калі за акном ідзе дождж, вецер раскачвае дрэвы, і не хочацца не тое што займацца справамі, але і з-пад цёплай коўдры вылазіць, напэўна, знаёма кожнаму. Дрэнны настрой перашкаджае нам бачыць прыгажосць наваколля, зніжае працаздольнасць і павялічвае рызыку ўзнікнення захворванняў. Каб дэпрэсіўныя думкі не трымалі нас у сваіх моцных абдымках, неабходны пэўныя хімічныя рэчывы і элементы. З восеньскай хандрой можна змагацца, але трэба ведаць, чым узмацніць свой рацыён. Ёсць шэраг прадуктаў, якія здольныя падняць нам настрой і палепшыць работу мозга.**



Галоўным хімічным рэгулятарам настрою ў нашым арганізме з'яўляецца **сератанін**. Гэта гармон, які ўтвараецца ў нервовых клетках. Канцэнтруецца ён у страўніку і кішэчніку, крыві і цэнтральнай нервовай сістэме. Дзякуючы яму, мы радуемся і добра спім, выдатна сябе адчуваем і даўжэй жывём. Сератанін утвараецца з трыптафану — незамянімай амінакіслаты, якую мы атрымліваем з ежай, а пад уздзеяннем ферментаў яна пераўтвараецца ў гармон, так неабходны нам для падтрымання псіхаэмацыянальнага балансу. Яго яшчэназываюць гармонам радасці ці задавальнення.

Як жа атрымаць неабходную колькасць **трыптафану**? З такіх прадуктаў, як сыр цвёрдых гатункаў, чырвоная рыба, індычка, чырвоная ікра. Прычым засвойвацца ён будзе значна лепш разам з вітамінам $B_6$. Таму варта дадаць у рацыён салодкі перац, кедравыя арэхі, фасолю, абляпіху.

**Тыразін** уплывае на кагнітыўныя функцыі мозга. Дэфіцыт гэтай амінакіслаты вядзе да сіндрому хранічнай стомленасці. Тыразін ёсць ва ўсіх прыродных бялках, лепш за ўсё засвойваецца бялок курынай грудкі, таксама ён прысутнічае ў бананах, авакада, міндалі. А яго сінтэз паляпшаецца пры дапамозе вітаміну $B_{12}$, які ўтрымлівае грэчка, скумбрыя, печань, кальмары.

Крыніцай **селену**, які нармалізуе абмен бялкоў, паляпшае памяць і настрой, з'яўляюцца бразільскія арэхі і часнок. Дапамагае сінтэзу сератаніну і **фoлiевая кіслата** (форма вітаміну $B_9$). Найбольшая колькасць гэтага вітаміну ў печані, апельсінах, брокалі і любой ліставой зеляніне. Яшчэ адзін неабходны мікраэлемент — **цынк**. Дадайце ў рацыён морапрадукты, імбір, водарасці, а таксама буры рыс і ўсе цытрусавыя.

Ну а галоўным «палівам» для нашага мозга з'яўляецца **глюкоза**. Яе крыніца, як вядома, вугляводы, якія ўтрымліваюць крухмалістыя прадукты. Таму наш восеньскі сняданак павінен складацца з гарачай кашы. Лепш, калі яна прыгатавана з цэльназерневых круп. У якасці асновы для бутэрбродаў варта выбіраць хлеб з мукі грубага памолу.

Здавалася б, нічога складанага ў тым, каб зрабіць разнастайным свой рацыён, няма. Тым не менш штодзень нас падпільноўваюць ворагі здаровага харчавання:

— Характар і структура харчавання за апошнія 50 гадоў змяніліся амаль да непазнавальнасці. Віной гэтаму наш імклівы лад жыцця, высокія тэхналогіі, генная інжынерыя, — кажа **загадчык клініка-дыягнастычнай лабараторыі, урач-лабарант 3-й гарадской дзіцячай клінічнай палiклінікі Мінска Ганна НІШЧЫМЕНКА.** — Мы і самі не заўважылі, як увайшлі ў звычку яда на бягу і перакусы, бо нават у сучаснага школьніка дзень распісаны па хвілінах. Ды і вытворцы прадуктаў хуткага харчавання імгненна сарыентаваліся. Між тым, ежу хуткага прыгатавання, раствараемыя супы і кашы, пюрэ, фаст-фуд, паўфабрыкаты варта ўжываць толькі тады, калі іншага выйсця няма. Яны ні ў якім разе не павінны замяняць штодзённыя паўнацэнныя сняданкі ці абеды. Трэба заўсёды памятаць, што з ежы мы будуем сваё здароўе, таму харчаванне павінна быць разнастайным, паўнацэнным, збалансаваным.

Але павысіць сінтэз «гармону радасці» дапамагае не толькі багаты рацыён. Гэтаму садзейнічаюць сонечнае святло і фізічная актыўнасць. Удзяляйце хоць бы 30 хвілін у дзень фізічным практыкаванням ці заняткам любым відам спорту (бег, плаванне, танцы і іншыя), дарыце сабе ў кожны сонечны дзень шпацыр на свежым паветры і атрымлівайце асалоду ад самай яркай на фарбы пары года. Чым разнастайнейшыя будуць ваш восеньскі рацыён і вашы карысныя занятки, тым менш у хандры шанцаў перамагчы вас.

Скажыце, доктар...

# ЦІ ВАРТА ЦЯРПЕЦЬ ПЯКОТКУ?



**Пякотку хоць раз у жыцці адчуваў кожны. Як правіла, гэта адносна небяспечнае наступства пераядання або ўжывання непадыходзячай ежы. Але часам пякотка, асабліва калі яна частая, сведчыць пра захворванне, якое патрабуе сур'ёзнага лячэння. Як узнікае гастраэзафагеальная рэфлюксная хвароба і чаму пякотку, як адну з яе праяў, нельга ігнараваць ці лячыць падручнымі сродкамі, расказаў урач агульнай практыкі 11-й гарадской паліклінікі Мінска Андрэй МАКАРЭВІЧ.**

***— Андрэй Міхайлавіч, як узнікае гастраэзафагеальная рэфлюксная хвароба?***

— Гэта захворванне — следства шматлікіх зваротных закідаў у стрававод змесціва страўніка. Яны магчымыя, калі ніжні стравакодны сфінктар (клапан) не вельмі добра працуе з шэрагу прычын. Яны да канца не вывучаны, самай распаўсюджанай лічыцца грыжа харчовай адтуліны дыяфрагмы. Гэта зрушэнне ў грудную поласць ніжняй часткі стрававода і часткі страўніка. Такі стан правакуе пашырэнне сфінктара, а адпаведна і закіды кіслага змесціва страўніка ў стрававод. Гэта самая яўная прычына, астатнія дакладна невядомы.

***— Ці мае захворванне ўзроставыя межы?***

— У дарослых яно сустракаецца незалежна ад узросту. Гэтак жа, як гастрыты могуць быць у маладым узросце, так і гастраэзафагеальная рэфлюксная хвароба. У лёгкіх формах яна сустракаецца ледзь не ў паловы насельніцтва нашай краіны.

***— Як яна сябе праяўляе? Што адчувае хворы?***

— Пякотка — першы і асноўны сімптом гэтага захворвання. Таксама павялічваецца слінааддзяленне (раптоўнае з'яўленне вялікай колькасці сліны ў роце), часта далучаецца адрыжка, бо сфінктар недастаткова сціскаецца, і адпаведна, газы паступаюць са страўніка ў стрававод і вонкі. Апроч гэтага, пацыент можа адчуваць камяк у горле, кіслы смак у роце, асабліва раніцай. У больш позняй стадыі, калі частае траўміраванне страўнікавым сокам слізістай стрававода прыводзіць да рубцовых змяненняў, адзначаюцца і іншыя сімптомы, у прыватнасці, парушэнне глытання: ежа дрэнна праходзіць са стрававода ў страўнік, і пацыент адчувае камяк у грудной клетцы, але гэта больш датычыцца цвёрдай сухой ежы.

***— Хранічная пякотка — сімптом толькі гэтага захворвання або яна можа сведчыць пра нейкія іншыя непаладкі ў арганізме?***

— Спачатку варта сказаць, што такое пякотка. Гэта адчуванне пякоты за грудзінай, якое ўзнікае з-за саляной кіслаты, што выдзяляецца ў страўніку. Гэта кіслата патрэбна нам для пераправлівання і прасоўвання ежы ў дванаццаціперсную кішку і абясшкоджвання некаторых кампанентаў ежы. Пякотка адчуваецца звычайна пад лыжачкай, але змесціва страўніка можа падымацца і вышэй, асабліва калі хворы знаходзіцца ў гарызантальным становішчы, — тады гэта адчуваецца як боль пры глытанні, боль у вобласці глоткі.

Ускосна пякотка можа быць сімптомам абдамінальнай формы інфаркту міякарда. Таму, калі пацыент скардзіцца на пякоту ў грудзях, для ўдакладнення дыягназу і выключэння вострага каранарнага сіндрому мы накіроўваем яго на ЭКГ.

***— Якія абследаванні праходзіць пацыент са скаргамі на пякотку?***

— У ідэале робіцца ўнутрыстрававодная PH-метрыя, якая вызначае кіслотнасць у ніжняй частцы стрававода. Але магчымасці яе выканаць ёсць усяго ў некалькіх стацыянарах. Таму звычайна пацыент праходзіць гастраскапію. Эндаскапіст ацэньвае слізістую стрававода, страўніка, на падставе гэтых даных ставіцца дыягназ. Калі маецца грыжа харчовай адтуліны дыяфрагмы, то робіцца рэнтген з кантрасным рэчывам.

***— Захворванне можна вылечыць?***

— Гэта хранічная хвароба. Але палепшыць стан і дасягнуць рэмісіі можна, і тут выкарыстоўваюцца як медыкаментозныя, так і немедыкаментозныя метады. Часта такі стан узнікае ў цяжарных жанчын, але тут яго складана аблегчыць, бо ім прэпараты не рэкамендуюцца. Яшчэ адна катэгорыя — людзі з высокай масай цела. Ім рэкамендуюць нармалізаваць вагу. Часта сімптомы непакояць пацыента ў гарызантальным становішчы. Таму мы рэкамендуем спаць на высокім узгалоўі, не есці на ноч, харчавацца рэгулярна і невялікімі порцыямі, пасля прыёму ежы не нагінацца на працягу 1-2 гадзін, не насіць паясы і тугое адзенне. Таксама важна памяняць некаторыя звычкі: адмовіцца ад курэння, асабліва нашча, зменшыць ужыванне алкаголю, тлустай ежы, шакаладу, кавы і газіраваных напояў.

Медыкаментозныя метады накіраваны на зніжэнне кіслотаўтварэння ў страўніку. Для гэтага выкарыстоўваюць інгібітары пратоннай помпы, той жа *амез*. Але калі гастрыты і язвы імі мы лечым восем тыдняў, то ў гэтым выпадку іх прымяняць варта ад трох да шасці месяцаў, а часам і пажыццёва. Яшчэ адна група прэпаратаў, пракінетыкі, нармалізуюць маторыку страўніка (а папросту прымушаюць сціскацца сфінктар) і перашкаджаюць зваротнаму закіду ператтраўленай ежы ў стрававод. Але гэтыя прэпараты не рэкамендуецца прымяняць працяглы час і рабіць гэта варта па прызначэнні і пад кантролем урача.

Выкарыстанне тэрапіі дазваляе дасягнуць рэмісіі, захворванне не пераходзіць у наступную стадыю. Калі форма запалення пакуль без эрозій, то на фоне прыёму прэпаратаў яны і не ўтворацца. Дарэчы, некаторыя прэпараты, якія выкарыстоўваюцца для лячэння бранхіяльнай астмы і кардыялагічных хвароб, могуць уплываць на тонус сфінктара. Тады з двух ліхаў трэба выбіраць меншае.

***— Што будзе, калі не лячыць гэту хваробу?***

— У запушчанай форме яна можа прывесці да ўтварэння язваў, страўнікава-кішэчных крывацёкаў і нават раку стрававода, слізістая якога з-за пастаяннага закіду кіслаты пачынае перабудоўвацца па страўнікавым тыпе (гэта называюць стравакодам Барэта) і ў рэшце рэшт становіцца чужароднай для арганізма: імунная сістэма пачынае гэты ўчастак атакаваць. Часта з-за рубцоў узнікае непраходнасць.

***— Многія не звяртаюць увагу на пякотку...***

— ...і прымаюць такія прэпараты, як *фосфалюгель*. Ён абвалаквае слізістую страўніка, і пацыент адчувае палёгку.

***— Так можна рабіць?***

— У вострай стадыі гэта не забаронена і аблягчае стан хворага. Але такія прэпараты не лечаць, у адрозненне ад інгібітараў пратоннай помпы і пракінетыкаў. Таму лепш звяртацца да ўрача і імкнуцца ліквідаваць прычыну: калі гэта грыжа, то яе пажадана ўшыць. Або прымяняць прэпараты, якія прызначыць доктар, на працягу рэкамендаванага ім тэрміну.

Землякі

# КРАЯВІДЫ, «СФАТАГРАФАВАНЫЯ» СЭРЦАМ

## Пад Мінскам адкрылі памятны знак у гонар славутага фотамайстра Яна Булгака

**Разглядваючы даўнейшыя фотаздымкі з вывамі старажытных храмаў, палацаў, знаёмых мясцін, мы часам нібы рэбус разгадваем, ламаючы галаву над пытаннем: што цяпер знаходзіцца на месцы, якое трапіла ў аб'ектыў фатографа сто і болей гадоў таму? Але мала хто задумваецца пра аўтара здымка. Ды і рэдка на якім фота ёсць аўтарскі капірайт. Слыннаму на ўвесь свет майстру фатаграфіі Яну Булгаку ў гэтым сэнсе пашчасціла, хоць шчасце гэта ён стварыў сам сваімі творчымі дасягненнямі, сваёй карпатлівай працай, якая занатавана ў вялікай колькасці фотаальбомаў, у ілюстрацыях даведнікаў і кніг для падарожнікаў.**

Імя Яна Булгака было досыць вядомае ў колах майстроў мастацкай фатаграфіі ў першай палове мінулага стагоддзя. А сёння ён — тэарэтык фотасправы, выдатны фотамастак, пераможца шматлікіх сусветных конкурсаў мастацкай фатаграфіі — набытак культурнай спадчыны, якой ганарацца Літва і Польшча. І толькі ў Беларусі, дзе ён нарадзіўся, дзе зрабіў першыя крокі ў творчасці, дзе стварыў, дарэчы, сваю першую фоталабараторыю, яго імя доўгі час замоўчвалася. Але ўсё роўна вярталася, адгукалася ў знаходках чарговага даследчыка помнікаў мінуўшчыны. Бо вельмі шмат пакінуў майстар фотаздымкаў, што красамоўней за ўсялякія словы сведчаць пра багатую архітэктурную, этнаграфічную і прыродную спадчыну тутэйшай зямлі.

Год таму ў вёсцы Пярэсека Міханавіцкага сельсавета, што ў Мінскім раёне, з'явілася вуліца імя Яна Булгака. Ініцыятарам такога перайменавання ранейшай Цэнтральнай вуліцы стаў бізнесмен, краязнавец і заўзяты аматар даўніны Францішак Жылка, які пабудаваў свой дом менавіта каля пляцоўкі, дзе калісь стаяла сядзіба Яна Булгака. Прыхільна паставіліся да такой ідэі дэпутаты сельсавета на чале са старшынёй Святланай Давальцовай, якая сама загарэлася жаданнем ушанаваць памяць слыннага майстра і мэтанакіравана праходзіла ўсе інстанцыі, усе ўзгадненні. З энтузіязмам удзельнічалі мясцовыя жыхары ў суботніках па добраўпарадкаванні тэрыторыі колішняй сядзібы Яна Булгака. А сам Франц Жылка, не цураючыся фізічнай працы, аднаўляў пацыху прысаду, што вяла ад сядзібы на Мінскую шашу.



Святлана ДАВАЛЬЦОВА і Франц ЖЫЛКА пасадзілі дрэўца канадскага дуба.

6 кастрычніка, у дзень нараджэння фотамастака, на расчышчанай пляцоўцы каля падмуркаў колішняга дома Булгака ў Пярэсецы быў урачыста адкрыты помнік — вялікі валун з памятнай шыльдай у гонар чалавека, які сваёй творчасцю спрыяў станаўленню мастацкай фатаграфіі не толькі Беларусі, Літвы і Польшчы, але зрабіў значны ўнёсак у сусветную культуру. На ўрачыстасцях, прысвечаных адкрыццю памятнага знака, прысутнічалі ўплывовыя навукоўцы, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, мясцовыя жыхары, якіх злучыла адна думка, адно жаданне — ушанаваць памяць слыннага земляка і пакінуць у спадчыну сваім нашчадкам гонар за чалавека, які карыстаўся вялікім аўтарытэтам у свеце.




Мастак Валерый КАЛЯСІНСКІ — аўтар памятнага знака.

А беларусам фотамастак пакінуў, па яго ж словах, «сфатаграфаваныя сэрцам» краявіды, старажытныя храмы і палацы сваёй малой радзімы — Навагрудчыны, а таксама маляўнічыя мясціны Гродзеншчыны ды Міншчыны. Сёння знікла незваротна шмат таго, што мелі шчасце назіраць на свае вочы сучаснікі Яна Булгака. Тым большую каштоўнасць маюць яго фотаздымкі.

Пад гукі феерверка аўтар праекта помніка Валерый Калясінскі скінуў покрыва са свайго твора. У гонар гэтай падзеі побач з памятным знакам Франц Жылка і Святлана Давальцова пасадзілі дрэўца канадскага дуба.

**Ала СТРАШЫНСКАЯ, фота аўтара.**

Кніжніца

# ІГРАЦЬ НА ПАМЯЦЬ,

## або Чым падобныя бібліятэкі будучыні да Ванесы Мэй?

**Гібкі, мабільны, паліглот, утаймоўвае лавіны інфармацыі, кіруе лічбавымі актывамі, ловіць дух часу, прагназуе патрэбы карыстальнікаў, наладжвае міжнародныя кантакты... Гэта сучасны бібліятэкар. І выходзіць ён з факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў — бібліятэчнай кузні кадраў, якая сёлета адзначае 75-гадовы юбілей. Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый (былы бібліятэчны) быў створаны ў 1944 годзе ў складзе Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, і, што адметна, менавіта на яго базе ў 1975 годзе адкрыўся Мінскі інстытут культуры (цяпер БДУКіМ).**



Першыя выкладчыкі бібліятэчнага факультэта Іосіф Сіманоўскі, Ніна Ватацы, Мікалай Талкачоў *(справа налева сядзяць)* з вучнямі. 1947 год.

Заняткі стартавалі 2 кастрычніка 1944 года і ладзіліся на базе мінскіх школ № 13 і № 35 з першымі 30 студэнтамі (а ў канцы 1950-х гадоў на факультэце навучалася ўжо больш чым 200 студэнтаў). Сярод першых выкладчыкаў бібліятэчнага факультэта — легендарныя Іосіф Сіманоўскі, які ўзначаліў кафедру і кіраваў ёю на працягу дзевяці гадоў, быў першым дэканам бібліятэчнага факультэта, і Ніна Ватацы. Іх можна разгледзець на фатаграфіі, датаванай 1947 годам, знойдзенай у архіве факультэта.



Будаўнікі перадалі першаму рэктару сімвалічны ключ падчас адкрыцця Мінскага інстытута культуры 6 кастрычніка 1975 г.

— 75 гадоў назад быў пакладзены пачатак прафесійнай бібліятэчнай адукацыі Беларусі, нагадвае прарэктар па навуковай рабоце БДУКіМ Віктар Языковіч. — За гэтыя гады бібліятэчны факультэт атрымаў моцнае развіццё. Падрыхтаваны тысячы высокакваліфікаваных спецыялістаў для бібліятэчнай сістэмы нашай краіны і замежжа.

Адсюль выйшлі такія мэтры бібліятэчнай справы, як Васіль Лявончыкаў, Лілія Дзямешка, Ніна Ляйко, Соф'я Паўлава, Мікалай Яцэвіч... Раман Матульскі прайшоў усе ступені ўніверсітэцкай бібліятэчнай лесвіцы, у лютым 1998 года быў прызначаны на пасаду дэкана, сёння з асаблівай цеплынёй выказваецца пра альма-матар:

— Адначасова з юбілеем роднага факультэта і ў мяне знамянальная дата: 40 гадоў таму я стаў студэнтам Мінскага інстытута культуры факультэта бібліятэказнаўства і бібліяграфіі. Здаецца, мінула не сорак гадоў, а чатыры, і зусім нядаўна Эдуард Міхайлавіч Краўчэня прымаў у мяне дакументы. Дарэчы, гэты чалавек адыграў ключавую ролю ў маім жыцці, таму што я выбіраў, куды ісці: у Мінск ці ў Кіеў. Краўчэня сказаў, што трэба ў Мінск. Сорак гадоў таму дэкан Уладзімір Аўрамавіч Фамін уручыў нам студэнцкія білеты. Мне пашанцавала: лекцыі чытаў першы студэнт з першага набору ў 1944 годзе — Аляксандр Філіпавіч Галуза, легендарная асоба. Ён расказваў, як праходзілі першыя заняткі ў той час у разбураным Мінску: больш разбіралі завалы, а снедалі адной цыгаркай. Заняткі па беларускай мове праводзіла Вера Адамовіч, жонка вядомага пісьменніка. Усе гэтыя асобы стваралі бібліятэчную адукацыю.

— За час існавання факультэта было падрыхтавана больш чым 16 тысяч спецыялістаў для бібліятэчнай і музейнай справы, — гаворыць дэкан факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Юлія Галкоўская.

